незалежная газета

№ 9 (607) 4 сакавіка 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## Лукашэнка адпачывае ў Сербіі

Кіраўнік Беларусі прыбыў на топавы лыжны курорт Сербіі ў суправаджэнні сям'і, памочнікаў, ахоўнікаў, кухара і нянек.

Старонка 8


У НУМАРЫ

**Life :) пакуль не ў кайф**
Мабільны аператар страціў 14 мільёнаў даляраў усяго за 4 месяцы. **Старонка 4.**

**Беларускіх кліентаў не прымаем**
Некаторыя амерыканскія правайдэры заблакавалі інтэрнэт-сайты, створаныя грамадзянамі Беларусі ці з тэрыторыі Беларусі. **Старонка 4.**

**За руль праз суд**
180 навучэнцаў мінскай аўташколы «Пілот-цэнтр» за два тыдні да выніковага экзамену даведаліся, што аўташкола абанкруцілася, а дырэктарам займаецца пракуратура. **Старонка 6.**

**Валадарку прадаюць**
Пра гэта паведаміў міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў. **Старонка 9.**

**Гэта іхні крызіс**
Кіраўнікі Беларусі пакараныя за тое, што прызвычаіліся жыць не па сродках. Піша Ігар Драко. **Старонка 5.**

**Страшная смерць у Мінску**
Бульдог абгрыз твар свайму гаспадару. **Старонка 9.**

**Рэкультывацыя меліяраванай свядомасці**
Наталка Бабіна піша пра захаванне ўкраінскай культуры Брэстчыны ў кантэксце гісторыі з «экстрэмісцкім» нумарам «Архэ». **Старонка 7.**

**Гісторыя бел-чырвона-белага сцяга**
**Старонка 11.**

**Ілля Стогаў: Крызіс — нагода пачаць проста жыць**
Знаны расійскі пісьменнік пра сучасную літаратуру, Лукашэнку, пуцінізм, стратэгіі паводзінаў у часы эканамічнага краху ў інтэрв'ю, якое ў «Советской Белоруссии» парэзалі. **Старонка 12.**





# Ёсць такая партыя!

Стваральнікі партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя хочуць здзейсніць у Беларусі цуд.
**Старонка 3.**

## Валютны голад не цётка

Яшчэ не ўсе асэнсавалі ашаламляльную лічбу: беларускі экспарт у студзені абваліўся на 47%.

Не дапамагла шокавая дэвальвацыя, не ратуе і паўзучая. Наша экспартаарыентаваная эканоміка курчыцца на вачах, і канца гэтаму працэсу пакуль не відно. Паводле афіцыйных звестак, за першы месяц году экспарт знізіўся на 47% у параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам. Сукупныя валютныя паступленні ў краіну скараціліся амаль удвая.

Імпарт таксама падаў, але ніжэйшымі тэмпамі, усяго на 34%, што прывяло да росту замежнагандлёвага дэфіцыту ўдвая. Краіна працягвала завозіць тавары і сыравіну, каб заводы далей працавалі, але была нядзольная прадаць сваю прадукцыю.

Асабліва балючым для дзяржаўнага скарбу стала падзенне экспарту калійных угнаенняў, пік якога звычайна прыпадае на зімовыя месяцы і які даваў ільвіную долю валютных даходаў краіны. На нізкім узроўні стаяць і цэны на нафтапрадукты — іншую аснову беларускага экспарту. Акрамя таго, правалійся расійскі рынак, які страціў платаздольнасць. Экспарт у Расію знізіўся на 50% — больш скараціўся толькі экспарт ва Украіну.

У выніку дэфіцыт замежнага гандлю за студзень 2009 году склаў 403 млн даляраў. Для параўнання, у студзені 2008 году гэты паказчык складаў 108 млн даляраў. Рост у 4 разы! Між тым валавы нацыянальны прадукт у даляравым вымярэнні ўпаў у выніку дэвальвацыі.

Каб кампенсаваць дэфіцыт валюты, урад устане перад неабходнасцю або браць новыя крэдыты за мяжой, або друкаваць для выплаты заробкаў пустыя рублі, якія выклічуць інфляцыйны ціск.

На пасяджэнні ўраду ў аўторак раздражнёны прэм'ер Сідорскі накінуўся на міністра працы і сацыяльнай абароны Уладзіміра Патупчыка. «Палова прадпрыемстваў ужо ходзіць на кароткі тыдзень, а міністр працы нічога не бачыць, у яго беспрацоўе 1%», — заявіў ён.

**Мікола Бугай**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — **старонка 2.**




### «Жаўнеры БНР» у Гродне

Прэзентацыя новае кнігі выдатнага сучаснага гісторыка, праф. Алега Латышонка «Жаўнеры БНР» пройдзе з удзелам аўтара. Кніга — гэта вычарпальны збор працаў, прысвечаных незалежніцкім вайсковым фармаванням 1917—1924 гадоў.

**5 сакавіка — Горадня, зала Таварыства беларускай школы, вул.Будзённага, 18.30.**

Даведкі праз тэл. (8–029) 550–79–69.

# Блізка локаць…

**Указ №100 дазваляе атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва нават тым, хто зусім нядаўна стаў у чаргу. Але не ўсё так проста, як падаецца на першы погляд.**

Льготныя крэдыты выдаюцца ў беларускіх рублях на тэрмін да 20 гадоў (для грамадзянаў, што пражываюць у населеных пунктах з насельніцтвам да 20 тыс. чалавек, і для шматдзетных сем’яў — 40 гадоў) пад 5% гадавых (у малых гарадах і для шматдзетных сем’яў — 3%).

Велічыня льготнага крэдыту, як паведамляецца на сайце Беларусбанку, вызначаецца паводле нармаванага памеру агульнай плошчы будаванага памяшкання і паказчыка вартасці будаўніцтва 1 кв. м. агульнай плошчы тыпавых спажывецкіх якасцей. Гэты памер не павінен перавышаць 90% (у малых гарадах і для шматдзетных сем’яў — 95%) вартасці будаўніцтва нарматыву льготна крэдытаванай плошчы жылога памяшкання тыпавых спажывецкіх якасцей. Паводле рашэння Мінгарвыканкаму ад 15 студзеня 2009 году дадзеныя нарматывы складаюць ад 1 340 000 рублёў да 1 967 000 у залежнасці ад тыпу і серыі жылога дому.

Просты разлік сведчыць, што сярэдняя сям’я, сукупны прыбытак якой адпавядае новым патрабаваням, здолее атрымаць у найлепшым выпадку каля паловы неабходнай для будаўніцтва жылля сумы, а то і меней. Напрыклад, сям’я з чатырох чалавек жадае збудаваць трохпакаёўку. Паводле афіцыйных крыніцаў, цана 1 кв. м. у долевым будаўніцтве ў сталіцы сягае ад $1300 да $4800. Возьмем найменшы паказчык цаны 1 кв. м. $1300 (Br3 718 тыс.) і нарматыў цаны ў 9-павярховым доме серыі 111-90 (Br 1 340 тыс.). Такім чынам, з улікам таго, што пад ільготны крэдыт трапляе толькі 90% ад нарматыву, а крэдыт выдаецца з разліку па 20 метраў на чалавека, наша сям’я атрымае ў банку 72 360 000 рублёў (60 * 1 340 000 * 0,9) з неабходных 223 080 000 (60 * 3 718 000). Пытанне, ці здолее сям’я з малымі прыбыткамі дадаткова самастойна адшукаць «свае» 160 мільёнаў — рытарычнае.

**Сямён Печанко**

## СЦІСЛА

### Расія дае грошы пад подпіс

Урады Беларусі і Расіі днямі падпішуць пагадненне пра выдачу Мінску чарговай траншы крэдыту на $500 млн, паведаміў міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын. «Пасля ўнясення паправак у бюджэт на 2009 год будзе пагадненне аб выдзяленні яшчэ $500 млн, як было прапісана ў мемарандуме», — сказаў Кудрын. Гэтыя грошы мелі прыйсці ў Беларусь яшчэ ў лютым, але Масква не пераявляла іх, пакуль намеснік міністра гандлю Беларусі не падпісаў інструкцыі, якая адмяняе абмежаванні на продаж 15 імпартных пазіцый, у тым ліку піва, сыроў ды іншай прадукцыі.

### МАП: Беспрацоўе ў Беларусі ў 5—6 разоў вышэйшае за афіцыйны паказчык

Узровень беспрацоўя ў Беларусі, калі разлічваць паводле метадалогіі Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), дасягае 4,8% ад эканамічна актыўнага насельніцтва. Гэткія звесткі падае «Экономический бюллетень» навукова-даследчага інстытуту Міністэрства эканомікі. Як вядома, афіцыйна беспрацоўе ў Беларусі застаецца на ўзроўні 0,9%, бо людзям няма сэнсу рэгістравацца ў якасці беспрацоўных — дапамога па беспрацоўі мізэрная, затое ганяюць на грамадскія працы амаль задарма.

### Новы прыхільнік дэструктыўнага курсу

25 лютага ў Кіеве адбылася рабочая сустрэча сакратара Рады нацыянальнай бяспекі Украіны Раісы Багатыровай з дзяржсакратаром Рады бяспекі Беларусі Юрыем Жадобіным. На сустрэчы была абазначаная супольная пазіцыя, што «Беларусь і Украіна ёсць еўрапейскімі дзяржавамі, як тэрытарыяльна, так і па культурнай і светапогляднай ідэнтычнасці нашых народаў». Таму асноўным прыярытэтам абедзвюх краін з’яўляецца «поўнамаштабная інтэграцыя ў еўрапейскую супольнасць». Прэс-сакратар Міністэрства замежных справаў Андрэй Папоў на брыфінгу ў мінулы чацвер заявіў, што ў такіх заявах няма нічога сенсацыйнага, бо беларускі бок заўсёды выступаў за «пабудаванне нармальных, прагматычных стасункаў з Еўропай». А яшчэ год таму Жадобін праславіўся заявай пра наяўнасць у краіне 1767 апазіцыйных дэструктыўных элементаў.

### Палітыкі засцераглі ад гульняў з Лукашэнкам

Група апазіцыйных палітыкаў у складзе старшыні Партыі БНФ Лявона Баршчэўскага, былых палітвязняў Аляксандра Казуліна і Міхаіла Марыніча, кіраўніка БСДГ Станіслава Шушкевіча і каардынатара «Хартыі-97» Андрэя Саннікава зрабіла заяву, што не лічыць магчымым далучэнне Беларусі да праграмы «Усходняга партнёрства», пакуль не будуць выкананыя ранейшыя патрабаванні ЕС аб правах чалавека. Іншыя лідэры апазіцыі — Анатоль Лябедзька і Аляксандр Мілінкевіч займаюць больш гнуткую пазіцыю. На іх думку, ад любых сувязяў з Еўропай ёсць карысць.

### «Белсату» адмовілі ў акрэдытацыі

Міністэрства замежных справаў Беларусі адмовіла ў акрэдытацыі бюро каналу «Белсат» у Беларусі на падставе таго, што дакументы няправільна аформленыя. Заява «Белсату» праляжала ў МЗС два месяцы.

### На Дашкевіча вылілі вядро кефіру

На лідэра «Маладога фронту» Змітра Дашкевіча невядомы выліў вядро кефіру. Гэта адбылося ў панядзелак, калі лідэр моладзі праходзіў у сталіцы на праспекце Незалежнасці побач з помнікам Феліксу Дзяржынскага. Мужчына выкінуў вядро і кінуўся наўцёкі. Вадкасць заліла таксама хлопца на імя Юльян, які ішоў разам з Дашкевічам, і жанчыну на вуліцы. Яны выклікалі міліцыю.

**ЗП; МБ**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю — **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828

МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828

МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Віктару А.** з Магілёва.
**А.Б.** з Ваўкавыску.
**Мікалаю Б.** з Нараўлянскага раёну.
**Валянціне К., А.К.** з Віцебскага раёну.
**В.С.** з Бабруйскага раёну.
**Сяргею В., Аляксандру П., Руслану К., Мікалаю К., Мікалаю Ч., Сцяпану Н., Лявонцію А., Міхаілу Б., Андрэю Н., Андрэю Г., Валерыю К., Сяргею В.** з Полацкага раёну.
**В.Б., В.Х., Паўлу Д., Паўлу Д., Барысу С.** з Светлагорскага раёну.

# Хрысціянскія прынцыпы, беларускі патрыятызм

**Менавіта такі слоган 28 лютага вісеў у актавай залі Дому культуры МТЗ, дзе праходзіў Устаноўчы з’езд партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя. За апошнеe дзесяцігоддзе гэта толькі другая спроба зарэгістраваць у краіне палітычную сілу.**

Першую ў 2007 годзе рабіў Уладзімір Навасяд, але Мін’юст адмовілася рэгістраваць ягоную Партыю свабоды і прагрэсу.

Аргкамітэт БХД пачаў працу яшчэ ў 2005 годзе, але да актыўных дзеянняў па рэгістрацыі хадэкі падышлі толькі цяпер. Аргкамітэт доўга не мог знайсці памяшкання для працы з’езду, некаторыя нават былі гатовыя праводзіць яго на плошчы. Аднак урэшце быў атрыманы дазвол ад Мінгарвыканкаму. У шэрагі заснавальнікаў БХД увайшло 1060 чалавек з усіх рэгіёнаў краіны. На з’ездзе ж прысутнічала 206 дэлегатаў.

Што праўда, у палацы МТЗ у гэты дзень хапала людзей з іншых палітычных сіл. Напрыклад, прысутнічаў кіраўнік Мінскага абласнога БНФ Зміцер Вінаградаў з Мядзелю. Як потым растлумачыў сам Вінаградаў, ён быў у якасці госця, хаця Севярынец і называў ягонае прозвішча ў ліку заснавальнікаў. Быў заўважаны і палескі фермер Мікалай Гаўрыленка, які балатаваўся на пасаду старшыні АГП.

З’езд пачаўся супольнай малітвай «Ойча наш», а таксама выкананнем гімну «Магутны Божа». Рэй адразу ўзяў адзін з сустаршынь БХД Павел Севярынец. Ён пералічыў тых людзей, якія сваёй працай найбольш спрычыніліся да стварэння беларускай хадэцыі. Двое з гэтага спісу не змаглі прысутнічаць у залі. Гамяльчанін Кастусь Жукоўскі адбывае сямісутачнае пакаранне ў ізалятары за акцыю ў абарону беларускай мовы, а ў пастара Эрнэста Сабілы праблемы са здароўем.

Ажыўленне ў залі выклікала імя і прозвішча старшыні падліковай камісіі — Аляксей Шыдлоўскі. Няўжо той самы, які нядаўна атрымаў палітычны прытулак у Чэхіі? Аж не, не той.

У сваім дакладзе Севярынец адзначыў, што сёння краіна патанае ў грахах, а для таго, каб нешта змяніць, людзям трэба цвёрдае апірышча, і гэтым апірышчам можа стаць БХД. «Беларуская хрысціянская дэмакратыя стане маральнай базай для дэмакратычных перамен. Мы не ствараем яшчэ адну апазіцыйную партыю, мы ствараем альтэрнатыву. Мы верым, што з дапамогай Божай волі Беларусь зажыве паводле прынцыпаў праўды, свабоды і справядлівасці. БХД ставіць сабе задачай ператварыцца ў вядучую партыю краіны. БХД — гэта партыя перамогі. У нас часта пытаюцца, дзе мы змаглі ўзяць столькі людзей. Любоў — гэта крыніца натхнення для БХД. Любоў да Бога, да чалавека, да Беларусі», — сказаў П.Севярынец.

Яшчэ адзін сустаршыня і імаверны кандыдат на пасаду прэзідэнта ад хрысціянскіх дэмакратаў Віталь Рымашэўскі зазначыў, што сёння ў партыю ўваходзіць 45% праваслаўных, 31% пратэстантаў і 13% каталікоў. Ён назваў адной з галоўных далейшых мэтаў стварэнне правацэнтрысцкай кааліцыі для ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах. А сярод стратэгічных партнёраў назваў Рух за Свабоду, Партыю БНФ, «Малады фронт».

Дарэчы, кандыдат на пасаду прэзідэнта ад БХД на з’ездзе так вылучаны і не быў. Вырашылі перанесці на больш позні тэрмін.

Потым былі выступы яшчэ двух сустаршынь — Георгія Дзмітрука з Кобрына і Аляксея Шэіна. Апошні відавочна спрабаваў паўтараць стыль тэлеевангелістаў, ходзячы з мікрафонам па сцэне. Шэін сярод іншага засяродзіўся на пераемнасці сённяшняй БХД з той, якая дзейнічала ў 1920-х.

Усе выступоўцы шмат гаварылі пра п’янства, аборты, самагубствы як прыкметы цяперашняга часу. З’явы, з якімі трэба весці барацьбу.

Адзіным святаром, які прамаўляў у залу са сцэны, стаў госць з’езду ксёндз Юры Барок з Глыбокага, які зазначыў, што альбо ў Беларусі будзе хрысціянская дэмакратыя, альбо не будзе ніякай.

На прапанову баранавіцкага ўніяцкага святара Яўгена Маліноўскага на кліч «Жыве Беларусь!» зала рэагавала «Жыве з Богам!». Паэт Уладзімір Някляеў прапанаваў БХД у якасці гімну ўласны верш «Сцяг».

Плаўна чарга перайшла да гасцей з’езду. Слова мелі амаль усе прадстаўнікі апазіцыйнай палітычнай эліты — Аляксандр Мілінкевіч, Аляксандр Казулін, Лявон Баршчэўскі, Анатоль Лябедзька, Мікола Статкевіч. Добрая магчымасць параўнаць стылістыку выступаў і харызму палітыкаў. Найбольшыя воплескі сарваў Анатоль Лябедзька. Напрыканцы свайго выступу лідэр АГП перадаў прэзідыуму новай партыі папку дэпутата Вярхоўнага Савету 13-га склікання. Як сімвал, ад былых дэпутатаў — будучым.

Зрэшты, не ўсе словы Лябедзькі знайшлі разуменне ў іншых гасцей. Напрыклад, старшыня АГП прапанаваў хадэкам увайсці ў склад Аб’яднаных дэмакратычных сілаў. На гэта з рэзкай крытыкай выступіў лідэр «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч, які сказаў, што ягонай арганізацыі там не месца, пакуль у АДС знаходзяцца камуністы. У сваёй антыкамуністычнай рыторыцы Дашкевіч не стрымліваўся: «Нельга сядзець на адной лаве паміж Богам і шатанам».

Яшчэ Дашкевіч заклікаў не баяцца быць нацыяналістамі ды двухсэнсоўна працытаваў Біблію: «Яшчэ тымі днямі бачыў юдэяў, якія пабралі сабе ў жонкі азамецянак, аманіцянак і маавіцянак, і ад таго сыны іх на палову гавораць па-азоцкі, ці мовай іншых народаў, і не ўмеюць гаварыць па-юдэйскі. Я зрабіў ім за гэта вымову і праклінаў іх, і некаторых з мужоў біў, рваў у іх валасы і заклінаў іх Богам...» (Кніга Нееміі, 13:23—25)

Прыкладна а трэцяй гадзіне БХД можна было лічыць сфармаванай. Была прынятая праграма і статут партыі. Падчас выбараў сустаршынь сенсацый таксама не адбылося, пасады занялі Павел Севярынец, Аляксей Шэін, Віталь Рымашэўскі і Георгій Дзмітрук. Кіраўнічым органам стала Нацыянальная рада, у склад якой увайшло 70 чалавек. Сярод іх былыя палітвязні Зміцер Дашкевіч, Артур Фінькевіч, Андрэй Кім, пастар Эрнэст Сабіла, бард Андрэй Мельнікаў.

Дзён праз дзесяць сябры партыі збіраюцца падаваць дакументы на рэгістрацыю ў Міністэрства юстыцыі. А затым, у выпадку станоўчага адказу, як кажуць, — непачаты край работы. Той самы Віталь Рымашэўскі напярэдадні з’езду гаварыў, што ідэі БХД гатовыя падтрымаць 80% жыхароў Беларусі.

**Зміцер Панкавец**



**За статут і праграму партыі галасавалі адзінагалосна.**



**Напрыканцы свайго выступу лідэр АГП Анатоль Лябедзька перадаў прэзідыуму новай партыі папку дэпутата Вярхоўнага Савету 13-га склікання. Як сімвал, ад былых дэпутатаў парламенту — будучым.**



**206 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны прыехала на з’езд БХД.**

# Беларускіх кліентаў не прымаем

Некаторыя амерыканскія правайдэры заблакавалі інтэрнэт-сайты, створаныя грамадзянамі Беларусі ці з тэрыторыі Беларусі.

Гэтак яны перастрахоўваюцца пры выкананні накладзеных на нашу краіну санкцый.

Правайдэр адмовіў у паслугах сайту Bielar.us, створанаму пры Беларуска-амерыканскім Задзіночанні праўнікам-беларусам Яраславам Крывым, які працуе ў ЗША. Сайт быў прысвечаны амерыканска-беларускім справам і не меў аніякага дачынення да беларускага ўраду.

Правайдэр заблакаваў сайт і паграажаў выдаліць яго, патрабуючы пераносу на іншы хостынг.

На Bielar.us не было нічога, што нават аддалена можна лічыць незаконным. Аднак падазрэнне Bluehost выклікала тое, што стваральнік сайту знаходзіўся ў Беларусі, калі адкрываў свой рахунак у іх кампаніі. Яны вылічылі гэта, адсачыўшы IP=адрас.

Паводле Bluehost, Беларусь — «краіна, на якую накладзеныя санкцыі» (sanctioned country). Прадстаўнік Bluehost патлумачыў Крывому, што ім было шмат працсей забараніць карыстанне хостынгам усім, звязаным з Беларуссю, чым высвятляць, хто ёсць хто.

У прынцыпе, амерыканскія санкцыі маюць дзейнічаць толькі ў двух выпадках:

а) супраць некаторых людзей, што «падрываюць дэмакратычныя працэсы альбо інстытуцыі ў Беларусі» і чые імёны пералічаныя на вэб-сайце Казначэйства ЗША; а таксама

b) супраць «кантраляваных Лукашэнкам нафтахімічных кангламератаў», як патлумачана Казначэйствам ЗША.

Але інтэрпрэтацыя Bluehost была зусім не вузкай.

Ён трактуе Беларусь нароўні з Іранам, Зімбабвэ і іншымі дыктатурамі, на якія накладзеныя санкцыі.

Іронія сітуацыі ў тым, што блог, заблакаваны Bluehost-ам, стварають актывісты Беларуска-амерыканскага задзіночання — адной з найстарэйшых беларускіх прадэмакратычных групаў у ЗША. Яго вашынгтонскае прадстаўніцтва часцяком грае вырашальную ролю ў кшталтаванні палітыкі ЗША ў дачыненні да Беларусі.

Як зазначае Яраслаў Крывой, «праблема большая, чым я напачатку думаў. Усе беларускія профілі былі выдаленыя ў 2007 годзе таксама адміністрацыяй Guru.com — папулярнага сайту для фрылансэраў. Яны больш не прымаюць беларускіх кліентаў. Іх матывацыя такая самая — зашырокая інтэрпрэтацыя санкцыяў... У 2008 годзе iKobo.com (апрацоўшчык онлайнавых плацяжоў) таксама папрасіў усіх беларускіх кліентаў сысці цягам пяці дзён, абапіраючыся на сваю інтэрпрэтацыю санкцыяў».

**Сяргей Боган**

# Life :) пакуль не ў кайф

Мабільны аператар страціў 14 мільёнаў даляраў усяго за 4 месяцы.

Аператар сотавай сувязі стандарту GSM ЗАТ «Беларуская сетка тэлекамунікацый» (гандлёвая марка life:)) за апошнія чатыры месяцы 2008 году (верасень—снежань) панёс страты на 13,87 млн. даляраў ЗША.

Пра гэта гаворыцца ў апублікаванай справаздачы кампаніі Turkcell, якая валодае 80% акцый беларускага аператара.

Паводле звестак на канец 2008 году ў life:) было 231 тыс. абанентаў. Актыўную дзейнасць на беларускім рынку пад новым брэндам аператар пачаў у снежні мінулага году.

ЗАТ «Беларуская сетка тэлекамунікацый» зарэгістравана 5 лістапада 2004 году. Пасля падпісання кантракту 29 ліпеня 2008 году ўвайшло ў міжнародную групу кампаній Turkcell. У канцы жніўня мінулага году Turkcell пералічыў першы плацеж 300 млн. даляраў за атрыманыя 80% акцый «БеСТ». Дадатковыя плацяжы па 100 млн. даляраў будуць ажыццёўленыя 31 снежня 2009 і 2010 гадоў. Яшчэ адзін плацеж на 100 млн. даляраў будзе ажыццёўлены пасля атрымання кампаніяй «БеСТ» станоўчага гадавога даходу.

Цяпер заснавальнікамі кампаніі «Беларуская сетка тэлекамунікацый» выступаюць кампанія Turkcell Group (80%) і Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі (20%).

**БелаПАН**



Міністэрства гандлю пасля шматлікіх пратэстаў гледачоў рэкамендавала спыніць паказ рэкламнага роліка «Лайфу», які абыгрывае сцэну родаў.

## СЦІСЛА

### Апусцее без яго Зямля

Запуск беларускага касмічнага спадарожніка Зямлі запланаваны на снежань гэтага году.

Пра гэта паведаміў старшыня прэзідыуму Акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч.

Новы беларускі спадарожнік будзе лягчэйшы за папярэдні — яго маса складзе ўсяго 350 кг. Касмічны апарат мае забяспечыць поўнае пакрыццё тэрыторыі Беларусі касмічнымі здымкамі.

### Стапталі боты — пераходзім на «берцы»

Камандуючы войскамі Заходняга аператыўнага камандавання генерал-маёр Аляксандр Мяжуеў патлумачыў, чаму беларускія салдаты дагэтуль насілі «кірзачы». «Стапталі тое, што было, каб не выкідваць. Цяпер пераходзім на «берцы» замест ботаў. Мы праводзім планамерную працу па абнаўленні салдацкай вопраткі».

### ДАІ дало чаду

Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя правяла ў ноч з 26 на 27 лютага ў клубе «Афрыка» акцыю «Моладзь за бяспеку!». У праграме акцыі было выступленне танцуючага рэгуліроўшчыка, якога падтрымлівалі танцоркі клубу і госці.

### Ва Украіне выдаўцам украінамоўнай кнігі нададзеныя прывілеі

Прэзідэнт Украіны падпісаў закон, згодна з якім выдавецтвы, што выпускаюць не менш за 50% прадукцыі паукраінску, атрымліваюць ільготы. Закон мае ўступіць у сілу з дня апублікавання.

**МБ;Mikalaj; БЕЛТА, БелаПАН**




# Дадатковыя факты пра агента «Бімбу» (гл. №7)

раскапаў беларускі карэспандэнт «Газеты Выборчай» **Андрэй Пачобут**.

Ягоны артыкул выйшаў з друку ў панядзелак.

1. Пракуратура Ігналінскага раёну Літвы абвінавачвае Бульку ў саўдзеле ў 56 забойствах. У кастрычніку 2008 году літоўскі суд прыняў рашэнне аб ягоным арышце. Калі б Булька выехаў з Беларусі ў любую краіну Еўрасаюзу, яго адразу арыштавалі б.

2. Паводле дакументаў КГБ Літоўскай СССР, ксёндз Булька ў 1950-я быў жанаты.

3. Высвячаны на ксяндза Булька быў у Польшчы. Сама ўрачыстасць адбывалася не ў касцёле, а ў садзе, што вялікая незвычайнасць і пярэчыць касцёльным традыцыям. Удзел у высвячэнні, акрамя біскупа Рамана Анджэўскага (ужо памёр) і Булькі, яшчэ бралі 2 сведкі, і ўсё. Гэта адзіны такі выпадак ва ўлоцлаўскай дыяцэзіі .

4. — О Матка Боска, — паўтарае сучасны біскуп ўлоцлаўскай дыяцэзіі Веслаў Мерынг, калі яму паказалі дакументы наконт Булькі. Разглядаецца магчымасць анулявання высвячэння Булькі, аб чым «Газеце Выборчай» заявіў біскуп Мерынг.

5. У ўдалося Літве знайсці тых, на каго даносіў Булька.

Акрамя таго, жывы адзін з агентаў, які разам з ім браў удзел у забойствах. З агентам паразмаўляць не ўдалося, але, паводле следчых, ён пацвярджае саўдзел Булькі ў забойствах.

6. Ніводная парафія ў Літве не пагадзілася прыняць ксяндза Бульку. Адусюль яго гналі самі парафіяне, бо хутка даведваліся пра ягонае мінулае.Тады яго накіравалі ў Беларусь, дзе ніхто пра яго нічога не ведаў.

7. Сам Булька казаў карэспандэнту «Выборчай»: «Была вайна, а цяпер мы ўсё павінны забыць і пачаць з чыстага ліста».

**Poczobut.livejournal.com**

# Гэта іхні крызіс

**Кіраўнікі Беларусі пакараныя за тое, што прызвычаіліся жыць не па сродках. Піша Ігар Драко.**

Усё-ткі не забываецца Бог на Беларусь. Паглядзеў на свет, калісьці ім створаны, пасміхнуўся з дурняў, якія глабалізаваліся нягледзячы на моўныя перашкоды, і вырашыў: досыць ужо ліхвярскіх грошай, бязглуздага спажывання і пошлага гламуру. І ляснуў цуд глабальнай эканомікі! Напісана ж было: каб зарабіць сабе на хлеб, трэба добра папацець. А яны тут са сваімі фондавымі спекуляцыямі, ф'ючэрсамі на нафту, рыэлтэрскімі і кансультацыйнымі паслугамі — не пацеюць, дык прыдумалі, як выкруціцца: сталі карыстацца антыперспірантамі: «для Яго», «для Яе», «для Іх Абаіх». Захацелі быць хітрэйшымі за Бога, ёлупні постіндустрыяльныя.

Мо і добры намер меў Усёмагутны, ладзячы выпрабаванне: офісны планктон, фінансісты, эканамісты і банкаўскія лайдакі першымі адчулі на сабе яго раз'юшанасць.

Але за імі і тыя, што пацелі на заводах і фабрыках, таксама са словам «крызіс» на вуснах пайшлі здымаць з рахункаў свае ашчаджэнні. Толькі хто не ведае, не кажыце, што пралетары на беларускай зямлі не асабліва запрацаваліся. Сам не так даўно быў зваршчыкам на «Амкадоры», бруду наглытаўся. Тады, выходзіць, не вылучыў нас Бог сярод астатніх? Не, вылучыў. І свой мудрагелісты фінт ён патлумачыў праз Аляксандра Лукашэнку: маўляў, дапніце вы, беларусы, што гэта не ваш крызіс, а іхні, тых, хто цяпер не можа купляць вашу шыкоўную прадукцыю. То бок церпім мы за чужыя грахі.

І за такія пакуты — хоць усю адміністрацыю, урад і гераічнага святога будаўніка Храму Нацбанку прывялебнага Пятра Пракаповіча на іконы і ў покуць кожнай хаты — мы маем права браць крэдыты ва ўсіх краінах хрысціянскага свету.

Вядома ж! Хто стварыў крызіс? Амерыканцы. Хрысціяне? Так. Няхай плацяць. Калі не непасрэдна, дык праз МВФ ці Сусветны банк.

Дзе апасля крызіс не ўтаймавалі? У Еўропе. Таксама хрысціянская тэрыторыя. Краіны там багатыя, і Банк рэканструкцыі і развіцця ёсць — трэба дзяліцца.

А што гэта за жабракі, якія не маюць грошай, каб набываць нашыя трактары, МАЗы, шкарпэткі, кілбасу і кафлю, і яшчэ просяць нас плаціць за іхні газ? Рускія, канечне. Мы не супраць таго, каб заплаціць вам, браты праваслаўныя, але вы спярша дайце нам мільярдаў сто вашых рублёў, тады акурат іх жа атрымаеце за свой газ.

Найвышэйшы закон сумлення, якім карыстаецца наша беззаганнае, нібы дзіця падчас хрышчэння, кіраўніцтва, гучыць наступным чынам: усе страты працавітага беларускага народу павінны кампенсаваць тыя, хто вінаваты ў крызісе і не здолеў зацугляць яго.

Шкада, не дачакаўся летуценнік Платон стварэння на мапе свету незалежнай Беларусі. Тое, што не пажадаў рабіць сіракузскі тыран, амаль праз 2,5 тысячы гадоў зрабіў іншы.

Хто, паводле Платона, мае права кіраваць ідэальнай дзяржавай? Напаўбог, напаўчалавек, які дакладна ведае, што такое Дабро само па сабе, Ісціна сама па сабе, Справядлівасць сама па сабе. І народу, якім валодаюць на падставе такіх ведаў і калі ён не сапсаваны прыкладам недасканалых плямёнаў, сорамна бедаваць ад таго, што неўзабаве будзе харчавацца праз два дні на трэці. Бо не толькі хлебам... Так, тут яму і ўсебеларуская лыжня, і конкурсы прыгажунь ды спявакоў з музыкамі, а таксама ток-шоу, на якім эксперты недвухсэнсоўна давядуць, як беларусам лепей хадзіць да ветру: трымаючы свежы нумар «СБ» у руцэ ці квіток «Суперлато» ў зубах. А пасля і мітрапаліт, пасвянціўшы цэхі заводу «Крышталь», раптам ачомаецца і пакліча нас не адступацца ад вялікай дабрадзейнасці ўсіх вернікаў — пакоры.

Там, дзе крызіс ёсць, усё робіцца так, як і павінна рабіцца: чарнаскуры self-made man з імем Барак тлумачыць выбарцам сваю эканамічную праграму, якая разам выступае і праектам кардынальнага абнаўлення Амерыкі; палкі аматар жанчын Сарказі прапаноўвае сістэму адраснай дапамогі і новы падыход да размеркавання прыбыткаў кампаній; тандэм Мядзведзеў—Пуцін усялякімі сродкамі стараецца прадухіліць сацыяльны выбух; прыбалты, бельгійцы, ісландцы мяняюць урады.

Нам жа ўся гэта мітусня недаспадобы, таму што Бог, сапраўды, не забыўся на Беларусь. Так, гэта не наш крызіс. Мы маем уласны: крызіс маральнасці. І доўжыцца ён без малога пятнаццаць гадоў. Між тым, Адам Сміт, першы эканаміст-тэарэтык, пісаў сваю вядомую кнігу як даследаванне па этычнай праблематыцы. У XVIII стагоддзі не было такога дробнага падзялення навукі на дысцыпліны і спецыялізацыі, таму «Багацце народаў» пайшло «пад грыфам» практычнай філасофіі, іншая тагачасная назва якой — этыка. А пратэстантызм яшчэ раней неразрыўна звязаў мараль і гаспадарчую дзейнасць. Беларускае ж know-how заключалася ў пагарджанні гэтай узаемазалежнасцю, і ўвесь наш дабрабыт, якім мы пахваляліся яшчэ паўгоду таму, быў насамрэч не зароблены, а выкленчаны.

Крызіс не наш, а іхні, але чамусьці ўжо цяпер кожны беларус, з улікам немаўлят, дзяцей, пенсіянераў і астатніх непрацаздольных, вінаваты замежным крэдыторам каля 1500$. А кіраўніцтва краіны працягвае пазычаць грошы.

А крызіс і пачаўся ж ад таго, што зашмат людзей у свеце пачало жыць не па сродках. У тым ліку і беларускае кіраўніцтва.

Простыя людзі маглі не ведаць, на якой схеме грунтуецца «беларуская эканамічная мадэль», але найвышэйшае чынавенства не саромелася раней і не саромеецца цяпер трымаць у руках уладу дзякуючы чужым грошам. Разбэшчаная халявай і нашым рабскім запабяганнем перад ёй, улада, персаніфікаваўшыся, скарацiла платонаўскія паняцці праз словазлучэнне «для мяне», і выйшла: Дабро для Мяне, Ісціна для Мяне, Справядлівасць для Мяне. У гнасеалогіі (яшчэ адно адгалінаванне філасофіі) такі давер самому сабе называецца «саліпсізмам» (ад лацінскага «solo» — адзін), а ў міжасабовых дачыненнях — хамствам.

Хрысціянскія мысляры прадказвалі надыход Царства Хама. І хто мог падумаць, што адразу адбудзецца яго парадыйная прэзентацыя на беларускай зямлі. Вось яна — расплата за талерантнасць і памяркоўнасць! А яшчэ ж калі было абвешчана: не мір я вам прынёс, але меч. Таму што хам разумее толькі сілу. Праўда, трэба памятаць, што адвага, як адзначыў яшчэ Арыстоцель, знаходзіцца паміж баязлівасцю і безразважнасцю. Галавой налажыць мы заўсёды паспеем, а вось, не ператвараючыся ў экстрэмістаў, заняць усю даступную нам інфармацыйную прастору клічам «Адстаўка!» мы можам.

Нам трэба развітацца з пошасцю, непрацiўленне якой неўзабаве можа прывесці нацыю да скону. Выбар сродкаў небагаты: сарафаннае радыё (цяпер ужо і ў выглядзе інтэрнэту) і плошча, — але яны дзейныя, праверана на іншых, здавалася б, невылечна хворых.

# Бернд Штанге: У Беларусі шмат п'юць


PHOTO.BYMEDIA.NET

У беларускім футболе існуе праблема ладу жыцця, заявіў галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Бернд Штанге на сустрэчы са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта 27 лютага.

«Шмат хуткіх футбалістаў. Яны стараюцца, але ёсць праблема ладу жыцця. Тут п'юць шмат алкаголю. Не ўсе могуць сказаць, што вольныя ад яго», — зазначыў Б.Штанге.

Паводле слоў трэнера, нядаўна ён «разам з адной камандай» вяртаўся з Турцыі.

«У «д'юці-фры» гульцы набралі алкаголю. Я пытаюся: гэта ты сабе? Адказ: для таты, для маці. Нельга сумяшчаць алкаголь і прафесійны спорт», — падкрэсліў Б.Штанге.

***Дзмітрый Уласаў*, БелаПАН**

# Справу закрылі, але не вызвалілі

**3 сакавіка ў Асіповічах прайшоў першы з двух запланаваных крымінальных судоў над актывістам «Маладога фронту» Арцёмам Дубскім.**

Шукаючы будынак суду ў Асіповічах, былі вымушаныя звярнуцца да мінакоў. Першай трапілася на вочы пажылая пара. «Дзе тут у вас вуліца Ленінская?» — «А вы, можа, на суд да нашага Арцёма едзеце?» – пытаннем на пытанне адказала бабуля. Апынулася, што гэта суседзі Дубскага, слухачы радыё «Свабода».

Судзілі хлопца за тое, што выкарыстаў чужую сім-карту, каб увайсці ў інтэрнэт. Пацярпелая Юлія Васільева, з якой Арцём разам вучыўся ў ліцэі, сцвярджала, што на яе імя прыйшоў рахунак больш чым на пяць мільёнаў рублёў.

Гаворкі пра тое, што Дубскі выкраў гэтую сімку, нават не вялося. Яе прынёс яму былы таварыш Руслан Чарапко. Некалі хлопцы сябравалі, але потым іх адносіны сапсаваліся, пра гэта абодва заявілі на судзе. Чарапка некалькі разоў у сваіх правакацыях выкарыстоўвала БТ. Падлетак з імпэтам паліваў брудам колішняга прыяцеля.

Увогуле, падалося, што суд праводзіўся выключна для бэтэшнай карцінкі. Бо тое, што бакі разыдуцца палюбоўна, было ясна ад пачатку. Ліберальны суддзя Русак упусціў у залу ўсіх ахвочых – нават тых, каму не хапала месца. Паводзіўся суддзя таксама вельмі лагодна.

Гадзіны праз дзве разбіральніцтваў пацярпелая заявіла, што гатовая зняць абвінавачанне, бо ўрон ужо даўно кампенсаваны. Суддзя пастанавіў спыніць крымінальную справу на згоду бакоў. Было абвешчана, што хлопец адразу вызваляецца з-пад варты. Рашэнне віталі апладысментамі. Але на волі Арцём пабыў толькі пару хвілін.


Юлія Дарашкевіч

Толькі Дубскі паспеў падпісаць усе дакументы па завершанай справе, як міліцыянты зноў узялі яго пад рукі і павезлі ў ізалятар. Праз нейкі час Арцёма чакае яшчэ адзін крымінальны суд – за ўхіленне ад хатняй хіміі, якую ён мусіў адбываць паводле прысуду па «Справе чатырнаццаці».

Моладзь правяла побач з ізалятарам невялікую акцыю салідарнасці, гукаючы «Свабоду палітвязням!» і «Жыве Беларусь!». Асіповіцкія праваахоўнікі на гэта адрэагавалі падагнанай пажарнай машынай, а таксама двума міліцыянтамі ў бронекамізэльках з аўтаматамі. У Мінску такога не пабачыш.

**Зміцер Панкавец,**
**Асіповічы—Мінск**

# За руль праз суд

**180 навучэнцаў мінскай аўташколы «Пілот–цэнтр» за два тыдні да выніковага экзамену даведаліся, што аўташкола абанкруцілася, а дырэктарам займаецца пракуратура.**

### Кепскае мінулае

Каб зразумець, чаму аўташколу «Пілот-цэнтр» наўрад ці чакае светлая будучыня, дастаткова было паглядзець яе старонку ў інтэрнэце. Там было напісана: «створана на базе ПНУП «Цэнтр Альянсаўта». Калі ж звярнуцца да гісторыі «Альянсу», становіцца зразумелым, што школу гэту можна адзначыць хіба што з адмоўнага боку. Дастаткова сказаць, што паводле статыстыкі за 2008 год школа «Альянсаўта» стала найгоршай з 47 мінскіх аўташкол! Агульны адсотак няздачы экзаменаў ДАІ з першай спробы дасягнуў шалёных 90,4%.

Пасля шэрагу праверак выявіліся фінансавыя махінацыі заснавальнікаў. Аказалася, што грошы даўно ўжо выдаткаваныя, а аплачаныя паслугі не прадастаўленыя. Міністэрства транспарту і камунікацый прыпыніла ліцэнзію. Навучэнцаў, якія ўжо аплацілі ўвесь курс, не дапусцілі да экзаменаў. У выніку яны не атрымалі правоў кіроўцы, а свае грошы вярталі праз суд.

Спыніўшы сваё існаванне, неўзабаве школа ўваскрэсла. Як ужо было сказана вышэй, на базе «Альянсаўта» з'явілася новая аўташкола — «Пілот-цэнтр». Зразумела, што без усялякай юрыдычнай адказнасці за дзеянні кампаніі-папярэдніцы. У траўні 2008 году «Пілот-цэнтр» атрымаў ліцэнзію тэрмінам адзін год і, такім чынам, мог легальна працаваць як мінімум да 14 траўня 2009 году.

Школа была зарэгістравана ў Мінскім раёне, што, з меркавання кіроўцаў, з'яўляецца перавагай. Выпускнікі маглі здаваць экзамены ў абласным ДАІ, а праехаць па гарадку з дзвюма дарогамі і адным святлафорам нашмат прасцей, чым па мегаполісе з ажыўленым рухам. Таму ахвотныя атрымаць запаветныя правы і накіраваліся ў новую аўташколу. Заняткі праходзілі на вуліцы Вышалескай, што ў пасёлку Кунцаўшчына, каля МКАДу. Але давучыцца людзям не ўдалося.


Тут яшчэ нядаўна ішлі заняткі.


Цяпер будынак, у якім знаходзіўся «Пілот-цэнтр» выглядае зусім безжыццёва.

### Уранку яны прачнуліся...

17 лютага група, якая прыйшла на чарговыя заняткі, убачыла, што ў навучальным класе няма нічога — ні замка на дзвярах, ні партаў, ні плакатаў на сценах. Выкладчык па медыцыне, які мусіў правесці заняткі, мог толькі развесці рукамі адпусціць навучэнцаў па дамах — займацца не было дзе.

У доме па адрасе Вышалескага, 15, дзе і мясцілася аўташкола, і цяпер нешматлюдна. На сцяне ўсё яшчэ вісіць інфармацыя пра набор у школу і нумары кантактных тэлефонаў. Дырэктарскі пакой зачынены, у адрозненне ад класу, дзе праводзіліся заняткі. Там наведвальнікаў чакаюць толькі голыя сцены. Супрацоўнікі суседніх фірмаў не ведаюць, што здарылася з аўташколай. З іроніі лёсу ў тым жа будынку знаходзіцца і пакой участковага міліцыянта.

Адна з ахвяраў «Пілот-цэнтру», **Андрэй Зашчэка**, расказвае:

— Самае крыўднае, што нам заставалася давучыцца зусім трохі. Праз два тыдні была прызначана дата ўнутранага экзамену. Мы здалі амаль увесь тэарэтычны курс.

**— Вы змаглі атрымаць тлумачэнні ад кіраўніцтва аўташколы?**

— Аднойчы мы датэлефанаваліся да дырэктара аўташколы Іллі Маладога, ён сказаў, маўляў, я хвараю, не чапайце мяне. Ягоны намеснік Віталь Малішэўскі прапануе нам свой варыянт. Мы самі павінны шукаць, дзе можна прайсці практычныя заняткі на машыне. То бок, нам прапануюць плаціць яшчэ нейкай іншай аўташколе, а потым «Пілот-цэнтр» выдасць нам сертыфікат, з якім мы самі адправімся ў ДАІ.

**— Колькі ваша група ўжо заплаціла за навучанне?**

— Мільён дзвесце тысяч рублёў. Але ў студзені на заняткі прыходзіў намеснік дырэктара і сказаў, што дзеля дэвальвацыі прыйдзецца даплаціць яшчэ 200 тысяч. Мы заплацілі і іх. І ўсё роўна засталіся ля разбітага карыта...

Пры ўсім жаданні даць слова другому боку — кіраўніцтву аўташколы — гэтага зрабіць не ўдаецца. Нумары былога дырэктара І.Маладога і выконваючага дырэктарскія абавязкі В.Малішэўскага адключаныя. Паводле непацверджанай інфармацыі, І.Маладым цяпер ушчыльную займаецца пракуратура.



Аб'яўка на дзвярах аўташкоры з выявай лунахода. Намёк, дзе шукаць канцоў?

### Ці дапаможа ім дзяржава?

Кіраўнік аддзелу бяспекі руху на транспарце Беларускага навукова-даследчага інстытуту «Транстэхніка» (гэтая ўстанова ў складзе Мінсітэрства транспарту і камунікацый займаецца праблемамі аўташкол) Міхаіл Свістун тлумачыць:

— У «Пілот-цэнтру» прыпынена ліцэнзія. Гэта значыць, што яны не могуць набіраць новых навучэнцаў. У аўташколы вялікія фінансавыя праблемы, таму наконт яе будучыні нельга сказаць нічога пэўнага.

У найбліжэйшыя дні дырэктар «Пілот-цэнтру» прадаставіць мне дакументацыю аб гаспадарчай дзейнасці школы і інфармацыю пра кожнага навучэнца. Мы не пакінем людзей у няпэўнасці. Калі людзі, якія не давучыліся, захочуць прайсці курс навучання да канца ў іншай аўташколе, даплаціўшы за гэта, мы дапаможам ім знайсці найлепшы варыянт. Тыя, хто спадзяецца вярнуць грошы з «Пілот-цэнтру», хай звяртаецца ў суд.

Як сталася, што на базе аўташколы, пазбаўленай ліцэнзіі, так лёгка ствараецца іншая школа, якая ізноў кідае сваіх вучняў?

У школаў розныя заснавальнікі, інструктары, выкладчыкі. Якія грошы круціліся ў «Альянсаўта» і «Пілот-цэнтр», я не ведаю.

Пацярпелыя навучэнцы дамовіліся сабрацца ўсёй групай праз тыдзень і вырашыць канкрэтна, што рабіць далей. Яны мяркуюць звяртацца ў міліцыю і суд, каб вярнуць грошы.

**Ягор Марціновіч, фота аўтара**

# Рэкультывацыя меліяраванай свядомасці

**Наталка Бабіна,**
**пісьменніца родам з Брэсту, піша пра захаванне ўкраінскай культуры Брэстчыны ў кантэксце гісторыі з «экстрэмісцкім» нумарам ARCHE.**

### Катастрофа

Гісторыя з канфіскацыяй і прызнаннем «экстрэмісцкім» нумару ARCHE (№2008'8) мае адзін аспект, які з уласцівай яму дакладнасцю вызначыў Валер Булгакаў. Адказваючы на пытанні журналістаў пасля «гратэскавага» суду ў Брэсце, ён адзначыў: «Само па сабе гэта даволі грознае папярэджанне, што, нягледзячы на ўсе гэтыя эрозіі Лукашэнкавай сістэмы, нейкія базавыя прынцыпы застаюцца непахіснымі. Яшчэ гэта вынік абсалютнай катастрофы беларускай культуры ў Брэсцкім рэгіёне».

Так, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі Брэстчына сапраўды адстае ў тым, што датычыць беларускасці, і становішча цалкам можна назваць «катастрофай». І цалкам магчыма, што мытніца Рэната Нядбаева сканфіскавала часопіс не таму, што ўчыталася ў яго змест (тады б яна якраз не мела прэтэнзій), а проста таму, што ён быў напісаны «падазронымі» літарамі. Цалкам магчыма, пані Нядбаева — паходжаннем з тых вайскоўцаў, што склалі львіную долю насельніцтва Брэсту за савецкім часам.

Брэст — горад спецыфічны. Складзены амаль што з адных прыезджых, якіх пытанні нацыянальныя не хвалявалі зусім, «прывязаны» да ідэалізаванай Брэсцкай крэпасці, горад тым не менш тады не пакідаў уражання савецкага і дэнацыяналізаванага. Наваат наадварот. Было ў яго сваё аблічча, свой водар, свой выгляд — бо тысячамі нітачак лучыўся з жывым катлом наваколля, Брэстчыны.

Які гэта быў патэнцыял для нацыянальнага руху Беларусі!

Каля дзесяці гадоў таму я напісала для «брэсцкага» нумару кіеўскага часопісу «Пам'ятки України» артыкул «Тут была Україна» пра стан украінскае мовы і культуры на Брэстчыне, які потым перадрукавалі некаторыя іншыя выданні ў Беларусі, Польшчы і Украіне і які шырока разышоўся ў інтэрнэце.

Быўшы ва Украіне на запрашэнне арганізатараў фестывалю «Беларуская вясна», я з радасцю пабачыла, што мой артыкул не забыты дагэтуль. І ў Кіеве, і ў Львове да мяне падыходзілі чытачы, цікавіліся станам рэчаў. Але на сустрэчы з чытачамі ў Львове чалавек, які назваўся актывістам Кангрэсу ўкраінскіх нацыяналістаў, а ў мінулым — арганізатарам «Талакі» Горбікам (так я пачула прозвішча, хаця і не зусім ўпэўненая) абвінаваціў мяне ў тым, што сваім артыкулам я «сутыкаю лбамі» беларускіх і ўкраінскіх нацыяналістаў, фальсіфікую рэчаіснасць і чыню шкоду.

Фармат сустрэчы не прадугледжваў палітычных спрэчак (пра гэта адмыслова дбалі арганізатары), і я абмежавалася тым, што коратка патлумачыла сваю пазіцыю. Мне было прыемна, што маю рэпліку «Ігнараваць нас, не заўважаць нас — гэта найгоршае з таго, што Украіна можа зрабіць для Беларусі і самой Украіны» заля сустрэла воплескамі. Але цяпер я палічыла патрэбным зноў вярнуцца да тэмы, што ўсё яшчэ выклікае страсці і прыносіць нечаканыя плады ў выглядзе гісторыі з ARCHE.




### Фатальная памылка

Пан Горбік агучыў тыповае стаўленне беларускіх нацыяналістаў да праблемы Брэстчыны.

Заганная стратэгія што да праблемы брэсцкіх украінцаў — па-мойму, адна з галоўных памылак беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху.

У тым, што ў паўднёвых раёнах Брэсцкае вобласці карэннае насельніцтва гаворыць па-ўкраінску, можа ўпэўніцца кожны, хто мае вушы. Тое самае пацвярджаюць мовазнаўцы. У мінулым гэтыя землі належалі да ўкраінскіх дзяржаўных утварэнняў і мелі эканамічныя і культурныя сувязі менавіта з украінскімі рэгіёнамі. Сучасная мяжа паміж Беларуссю, Украінай, Польшчай была праведзена Сталіным з эканамічных, але не з этнаграфічных меркаванняў.

Украінскі нацыянальны рух на гэтых землях быў, ёсць і, магчыма, будзе. Існуе, вядома ж, пагроза, што ён знікне пад націскам русіфікацыі, — тое самае пагражае і руху беларускаму. Тым часам паміж украінскімі і беларускімі актывістамі на Брэстчыне захоўваецца ўзаемны недавер, а сучасныя беларускія гуманітарныя даследаванні старанна абыходзяць любыя спрэчныя моманты — хоць усё тое якраз мусіла б уяўляць навуковую цікавасць.

У выдатнай кнізе Севярын «Люблю Беларусь» у артыкулах, прысвечаных Брэстчыне — ні слова пра гэта.

### Чубарыкі

Савецкая палітыка русіфікацыі палягала на тым, каб максімальна заглушыць «голас крыві», усе нацыянальныя ідэнтычнасці, альтэрнатыўныя савецкай. На Брэстчыне знішчалі самую згадку пра ўкраінскасць. Голас крыві — гэта не прыгожы мастацкі вобраз, а гістарычнае пачуццё, якое прыводзіць чалавека да ўсведамлення нацыянальнага.

Беларуская нацыянальная ідэя на Брэстчыне абапіраецца на палітычную прыналежнасць тэрыторыі да Беларусі. Варта адзначыць, што савецкія ўлады свядома зрабілі ўсё, каб здыскрэдытаваць яе, напрыклад, адкрываючы пасля Другой сусветнай вайны спрэс па вёсках беларускія школы, што выклікала адпрэчванне. Калі насельніцтва звярталася з просьбамі адкрываць украінскія (якія працавалі тут раней) — актывістаў рэпрэсавалі, калі расійскія — ахвотна пераводзілі навучанне на расійскую мову.

Моц беларускай нацыянальнай ідэі на Брэстчыне была (на жаль, і ёсць) недастатковая, каб уцягнуць шырокія масы, таму яна не была такой небяспечнай для ўладаў. Не маючы натуральнай апоры, яна хутка слабела, што цалкам задавальняла ўлады.

Гістарычную свядомасць імкнуліся звесці да нуля, каб з гэтага нуля стварыць нацыянальную па форме, а савецкую па змесце новую, меліяраваную ідэнтычнасць. Барацьба з найменшай згадкай пра ўкраінскасць прымала часам анекдатычныя формы. Напрыклад, чытаючы напісаную па-расійску цудоўную кнігу мемуараў старога брэсцкага камуніста, сябра КПЗБ Васіля Ласковіча, я доўга не магла зразумець, што азначае слова «чубарык», якім да маладых мясцовых хлопцаў разпораз звяртаюцца прадстаўнікі польскай адміністрацыі. І толькі потым да мяне дайшло: дык гэта ж рэдактар кнігі так замяніў крамольнае «хахлы»! Каб і яно не нагадвала, што «тутэйшыя» Брэстчыны не былі абыякавыя да ўкраінства. Тым не менш, у кнізе даецца выразная і яскравая карціна грамадскага жыцця той пары — і яе ўкраінскіх складнікаў у тым ліку.

### Саюзнікі ці праціўнікі?

Беларускі нацыянальны рух у цяперашніх умовах пашыраецца, звяртаючыся да найлепшых пачуццяў людзей, апелюючы да таго маральнага закону, які ўнутры кожнага з нас. Там, дзе ён ідзе на маральныя кампрамісы, супраць справядлівасці, там ён слабее і церпіць паразы.

Калі б на пачатку 1990-х беларускія нацыянальныя сілы не адштурхнулі ўкраінскага руху, падтрымалі яго намаганні ў адкрыцці ўкраінскіх класаў, выданні і распаўсюдзе ўкраінскай прэсы і кніг, то напэўна вынікі рэферэндуму 1995 году на Брэстчыне былі б іншыя, то напэўна цяпер беларускі рух там меў бы большую падтрымку. І мытніца Рэната Нядбаева, магчыма, паводзіла б сябе інакш.

Але адбылося тое, што адбылося. Лукашэнка паставіў тлустую кропку ў спрэчцы беларускіх і ўкраінскіх нацыяналістаў у Брэсце. Толькі жыццё не скончылася, і пытанне: мы хто, саюзнікі ці ворагі — яшчэ больш актуальнае цяпер, чым тады.

Няма чаго ствараць міфы — якімі б карысьнымі яны ні здаваліся. Калі сустракаеш у нібыта навукова-папулярнай кнізе дадзеныя пра тое, што паваенны беларускі супраціў саветам налічваў 50 тыс. узброеных удзельнікаў (так пішуць С. Ерш, С. Горбік у кнізе «Беларускі паваенны супраціў» — не ведаю, мой апанент са Львова ці ягоны цёзка), то гэта выклікае раздражненне, як і ўсё, што не пацвярджаецца фактамі. Рознага роду маніпуляцыі не дадаюць павагі.

Не дадае павагі і рэлятывісцкая пазіцыя: беларуская мова — родная, яе трэба захоўваць і берагчы, беларуская ідэя — вартая, асэнсаванне беларускасці — аснова асобы любога беларуса. А хіба ўкраінская для мяне і соцень тысяч маіх землякоў не родная? А карані свае мы хіба не мусім асэнсоўваць? Інакш як праз украінскасць да ўсведамлення ідэі агульнабеларускага дому многім прыйсці немагчыма. Гэта я кажу як чалавек, які прайшоў гэтую частку дарогі.

Крыўдна чуць абвінавачванні ў тым, што я асмельваюся лічыць сабе ўкраінкай, а Брэстчыну — этнічна ўкраінскай. Так, асмельваюся. І працую ў «Нашай Ніве». І пішу па-беларуску. І аддаю дзяцей у беларускія школы. І зраблю ўсё, каб яны мелі добрыя веды ўкраінскай і беларускай гісторыі.

Спадзяюся, што ў беларусаў і ўкраінцаў хопіць розуму трымацца разам, бо ў адваротным выпадку іхняя спрэчкі ўжо вельмі хутка зробіцца абсалютна бессэнсоўнымі, і на пустое поле, выраўненае магутным каткам русіфікацыі, можна будзе смела перасяляць з Піцера Скарыну — які, як лічыць Лукашэнка, жыў і тварыў там. Вось да гэтага абсурду, прадэманстраванага нашым «праваслаўным атэістам», і імкнуцца давесці нашу свядомасць русіфікатары.

### «Я іх перахрысціў»

...Забрахаў сабака, і я вызірнула ў акно. Ля веснічак стаяў высокі сівы пажылы чалавек.

— Мама, тут цябе пытаюцца!

Я была ўпэўненая, што гэта прыйшоў знаёміца нехта з суседзяў.

— Добры дэнь, я Володымыр Лэонюк, — назваў сябе госць, і я ледзьве не ўскрыкнула ад нечаканасці.

Уладзімер Леанюк — ураджэнец вёскі Крытышын Іванаўскага раёну, які цяпер жыве ў Львове.

Калі яму было 18 гадоў, у 1952 годзе, яго арыштавалі за сувязі з УПА і антысавецкую прапаганду (ягоная віна заключалася ў тым, што ён перапісваў ад рукі антысавецкія ўлёткі) і асудзілі на 25 гадоў лагероў.

Пасля смерці Сталіна яго выпусцілі, але неўзабаве зноў асудзілі — на гэты раз за ўдзел у, як бы цяпер сказалі, незарэгістраванай арганізацыі, якая ставіла за мэту дабівацца незалежнасці Украіны. Агулам спадар Леанюк адседзеў амаль 20 гадоў.

Ужо ў сталым узросце спадар Леанюк палічыў сваім маральным абавязкам падрыхтаваць і выдаць «Слоўнік Брэстчыны» — міні-энцыклапедыю украінскага жыцця Брэстчыны, якая выйшла ў Львове ў 1996 годзе.

Гэтая кніга выклікала тады ў Беларусі вялікія спрэчкі, яе выдалілі з бібліятэк, куды яе былі разаслалі ўкраінскія актывісты. Вялікія прэтэнзіі мелі да яе тады і беларускія нацыяналісты: маўляў, як так, там сцвярджаецца, што на Брэстчыне жывуць этнічныя ўкраінцы! Крамола!

І вось цяпер гэты чалавек сядзіць у нас у доме і расказвае.

У спадара Леанюка светлы розум і выдатная памяць. Ён гаворыць пра тое, як сядзеў у Брэсцкай турме над Мухаўцам, потым — у «амерыканцы» ў Мінску, называе прозвішчы беларусаў, габрэяў, палякаў, з якімі сустракаўся там, а потым на Інце і ў Мардовіі, і падрабязнасці яго аповеду ствараюць яскравую карціну жыцця, чалавечай стойкасці і ўпартасці ці, бывала, надлому і разбурэння...

— Мінск прыгожы горад, — кажа ён. — Спадзяюся, з цягам часу ён стане і больш нацыянальным. Калі бываў тут раней, не чуў беларускай мовы. А цяпер — пачуў. Маладыя людзі гаварылі паміж сабой на вуліцы. Я так быў усцешаны, нават перахрысціў іх.

Ці патрэбна яшчэ аб нечым дыскутаваць? Ці трэба яшчэ нешта даказваць?

Гэты артыкул быў таксама надрукаваны ва ўплывовай львоўскай газеце «Поступ», якая выходзіць накладам 90 тыс. асобнікаў, — надрукаваны па-беларуску.

# Крызісны адпачынак Аляксандра Лукашэнкі



Той самы гатэль «Гранд».

**Кіраўнік Беларусі прыбыў на топавы лыжны курорт Сербіі ў суправаджэнні сям'і, памочнікаў, ахоўнікаў, кухара і нянек.**



Горны хрыбет Капаонік — самае прэстыжнае месца зімовага адпачынку ў Сербіі — знаходзіцца на поўдні краіны. «Боінг-737» з беларускім прэзідэнтам на борце прыбыў у аэрапорт імя Канстанціна Вялікага ў горадзе Ніш у суботу. Частка світы прыляцела другім рэйсам на самалёце «Эмбраер», паведаміў дырэктар аэрапорту.

Толькі калі інфармацыя пра адпачынак Лукашэнкі ў панядзелак разышлася ў беларускім інтэрнэце, беларускае афіцыйнае агенцтва БелТА таксама распаўсюдзіла вестку, што Лукашэнка знаходзіцца ў Сербіі з «працоўным візітам». Паводле БелТА, ён сустрэнецца з кіраўніцтвам краіны і бізнесоўцамі. Агенцтва прызнае, што ў межах візіту таксама запланавана, што Лукашэнка правядзе ў Сербіі некалькі дзён адпачынку.

На лыжным курорце пераважаюць трохзоркавыя гатэлі, даступныя сярэдняму сербу, але чатырохзоркавы «Гранд», дзе спыніўся беларускі кіраўнік са світай, вылучаецца. У ім ёсць закрыты басейн, джакузі, сауна, шматлікія кавярні, крыты тэнісны корт, а таксама фітнэс-цэнтр і салярый.

Гатэль «Гранд» прапануе 2-, 3- і 4-мясцовыя прэзідэнцкія апартаменты, дзе цэны вагаюцца ад 88 да 114 еўра за ноч на чалавека. Больш простыя нумары (1—5 чалавек у нумары) каштуюць ад 50 да 84 еўра. За 80 метраў ад гатэлю знаходзіцца пад'ёмнік «Караман Грэбен»: скіпас (дзённы абанемент) на яго каштуе 1700 дынараў (каля 66 тысяч рублёў).

Сербская газета Vesti піша, што разам з Лукашэнкам прыляцелі сем'і ягоных сыноў, а таксама эскорт у складзе прыкладна 150 чалавек. Іншыя выданні гавораць не пра 150, а пра 30 чалавек, якія суправаджаюць беларускага кіраўніка. Усе яны спыніліся ў прэзідэнцкім люксгатэлі «Гранд». Пастаяльцаў з яго на час перабывання беларускай дэлегацыі перасялілі ў іншыя гатэлі.

Сербскія газеты напісалі, што беларуская дэлегацыя прызямлілася не ў галоўным аэрапорце краіны, куды зазвычай кіруюцца замежныя дэлегацыі, а на рэгіянальным лётнішчы ў Нішы, каб захаваць факт прыезду ў таямніцы. Аднак журналісты не драмалі і на поўдні Сербіі.

Характэрна, што ў адрозненне ад кіраўнікоў дэмакратычных краінаў, Лукашэнка адпачывае, не афішуючы асабліва інфармацыю пра тое, а склад ягонага суправаджэння журналісты ацэньваюць на вока.

Са словаў работніка гатэлю стала вядома, што дэлегацыя праводзіць сябе ціха, а асабісты кухар прэзідэнта гатуе разам з кухарамі гатэлю. Прадстаўнік гатэлю расказаў, што сям'ю Лукашэнкі суправаджаюць таксама ахоўнікі, а дзяцей — нянькі.

**Курорт Капаонік:**
Вышыня — 2017 м над узроўнем мора
Вышыня гарналыжнага цэнтру — 1770 м
Максімальны перапад вышыняў — 512 м
Агульная даўжыня трасаў — 60 км
Колькасць пад'ёмнікаў — 22
Лёгкія трасы — 11
Сярэднія трасы — 7
Складаныя трасы — 4
Найдаўжэйшая траса — 3,5 км

## Лыжныя хронікі

### 1995. І лыжня пачалася...

Была ўпершыню праведзена «Мінская лыжня» — масавае катанне паспалітага люду і чынавенства на лыжах у ваколіцах сталіцы. Нязменным пераможцам «Лыжні» робіцца Аляксандр Лукашэнка.

### 1998. Японскі вояж

Падчас Алімпіяды ў Нагана глава беларускай дзяржавы, а па сумяшчальніцтве — кіраўнік Алімпійскага камітэту, наведаў Японію. Візіту не чакаў ніхто. На падлёце высветлілася, што Японія не дае свайго дазволу, таму што беларуская дэлегацыя, што не была заяўлена афіцыйна, не мае візаў. Па каторым часе справу з дазволам неяк уладзілі.

Акрамя назіранняў за ходам гульняў, Лукашэнка таксама быў заняты катаннем на лыжах па японскіх абшарах і аднаго разу нават заехаў на прыватную тэрыторыю.

### 2001. Лыжаролеры

Да свята вызвалення Мінску ад фашысцкіх захопнікаў была праведзена гонка на лыжах, да якіх былі прымацаваныя роліквыя канькі, на так званых лыжаролерах. Пад ліпеньскім сонцам на лыжам упершыню можна было бачыць і беларускага кіраўніка.

### 2002. Інсбрук

Аляксандр Лукашэнка раптоўна знік з Беларусі ў сярэдзіне сакавіка. Пра месца адпачынку афіцыйныя крыніцы нічога не паведамлялі. Журналісты знайшлі беларускага прэзідэнта на аўстрыйскім гарналыжным курорце, ля Інсбруку.

Ужо пасля сенсацыйнай навіны прэсавая сакратарка Пяткевіч удакладніла інфармацыю. Сакратарка таксама паведаміла, што за час свайго знаходжання ў Аўстрыі А.Лукашэнка, акрамя афіцыйных сустрэч і адпачынку, некалькі разоў гуляў у хакей і ў гульні з адной з мясцовых «аматарскіх камандаў закінуў восем шайбаў у браму супернікаў».

Прэзідэнт-люкс у тым аўстрыйскім гатэлі каштаваў блізу 800 даляраў.

### 2003. «Рэдысан САС Лазурная Пік Гатэль»

Аляксандр Лукашэнка адпачываў у Расіі, у «Рэдысан САС Лазурная Пік Гатэль» побач са знакамітым гарналыжным курортам Красная Паляна. Акрамя 5-павярховага корпусу, на тэрыторыі гатэлю знаходзяцца 6 вілаў люкс. У адной з іх і пасяліўся Аляксандр Лукашэнка. Кошт такой вілы на той час складаў 890 еўра за суткі.

### 2004, Чымбулак.

Прэс-служба Александра Лукашэнкі паведамляла, што «глава беларускай дзяржавы знаходзіцца з працоўным візітам у Казахстане, дзе абмяркоўвае праблемы мадэрнізацыі беларускіх нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў». Але ж у прэс-службе казахскага прэзідэнта журналістам паведамілі, што гэта «прыватны візіт», а сам Назарбаеў знаходзіцца ў сталіцы, Астане, дзе бярэ ўдзел у святкаванні Дня Незалежнасці.

### 2004, Славенія.

За два месяцы да ўваходжання Славеніі ў Еўрасаюз Лукашэнка ездзіў на славенскі гарналыжны курорт Крвавец. Толькі пасля публікацый у СМІ прэс-служба Лукашэнкі паведаміла, што ў аўторак скончыўся ягоны кароткатэрміновы візіт у Славенію, дзе «адбыўся шэраг працоўных сустрэчаў главы беларускай дзяржавы з выбітнымі палітычнымі дзеячамі і прадстаўнікамі буйнога бізнесу».

Прэзідэнцкі люкс у замку тады каштаваў 858 еўраў за ноч.

### 2008 год. «Гранд-гатэль Паляна».

На пачатку лютага мінулага году Лукашэнка знаходзіўся з працоўнай паездкай у Расіі і наведаў горна-турыстычны цэнтр «Гранд-гатэль Паляна». З ім адпачывалі выбраныя зоркі беларускай эстрады...

Звяртае ўвагу, што прэзідэнцкая прэсслужба абнародавала факты горнага адпачынку А.Лукашэнкі толькі пасля таго, як яго ўскрылі беларускія незалежныя ці замежныя СМІ. Гэта дазваляе меркаваць, што не ўсе падарожжы Лукашэнкі становяцца вядомымі.

У параўнанні з гатэлямі, дзе Лукашэнка спыняўся мінулыя гады, сёлетні выглядае ціпла: усяго чатыры зоркі, дый вядомасць не міжнародная. Крызіс...


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Валадарку прадаюць

**Пра гэта паведаміў міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў.**

«Мы зацікаўленыя ў продажы СІЗА. На сёння ёсць прапановы ад расіян і аўстрыйцаў. Адзіная ўмова — захаваць у нязменным стане Пішчалаўскі замак. Іншыя аб’екты на тэрыторыі СІЗА павінны быць знішчаныя, а на іх месцы ўзведзеныя новыя», — сказаў міністр.

Новы следчы ізалятар будзе пабудаваны ў Калядзічах.

Яшчэ тры гады таму была прададзеная інвестарам мінская калонія №1, што на Кальварыйскай. «Калонію знясем. На гэтым месцы будзе мікраён, дзе будуць жыць людзі. Новую калонію будаваць не будзем, бо няма пільнай патрэбы. Колькасць злачынцаў, якія адбываюць турэмнае пакаранне, апошнім часам змяншаецца», — паведаміў У.Навумаў.

**Зміцер Панкавец**

## Страшная смерць у Мінску

**Бульдог абгрыз твар свайму гаспадару.**

Злоўжыванне алкаголем прывяло ў пачатку лютага жыхара Завадскога раёну г. Мінску да страшнай смерці.

Мужчына выпіў лішняга і не знайшоў нічога лепшага, як палезці цалавацца да свайго сабакі. Той, як і большасць сабак, цярпець не мог паху алкаголю. Бульдог накінуўся на гаспадара і адгрыз яму частку твару.

Хуткая дапамога, якая прыехала неўзабаве, паспела толькі зафіксаваць смерць мужчыны. Сабаку ўсыпілі.

**Ягор Марціновіч**

## Навумаў: арышты ў Ваўкавыску не звязаныя з 4 ліпеня

Работа над раскрыццём выбуху ў ноч на 4 ліпеня працягваецца. Уладзімір Навумаў паведаміў, што найбліжэйшымі днямі мае намер правесці сустрэчу з некалькімі журналістамі, дзе раскажа пра ходу следства пад умовай, што гэта не будзе вынесена на старонкі СМІ. «Не сакрэт, што падчас расследавання гэтага злачынства мы найперш арыентаваліся на ўсё звязанае з выбухоўкай, зброяй. У ходзе аперацыі Ваўкавыску была арыштаваная група асобаў, якая мела ў сябе і выбухоўку, і зброю з намерам яе выкарыстаць», — пракаментаваў Навумаў справу ваўкавыскіх прадпрымальнікаў.

Паводле ягоных словаў, следства будзе скончана цягам некалькіх месяцаў. Аднак справа Мікалая Аўтуховіча і ягоных паплечнікаў ніяк не звязаная з выбухам на Дзень рэспублікі.

Варта адзначыць, што праваабаронцы сумняюцца ў правамернасці арышту Аўтуховіча і лічаць справу палітычна матываванай.

Раскрыццё злачынства 4 ліпеня не дае магчымасці Навумаву планаваць асабістыя справы, у тым ліку адпачынак. Хаця і ёсць прапановы па ўзыходжанні на Эверэст.

**ЗП**

## Піва — ад 21 году

**Узроставае абмежаванне на продаж спіртных напояў у Беларусі плануецца павялічыць да 21 году.**

Такое палажэнне зьмяшчаецца ў законапраекце «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», які будзе разгляджаны палатай прадстаўнікоў на вясенняй сесіі.

Міністр унутраных справаў Навумаў сказаў, што пазітыўна ставіцца да такой ініцыятывы. Маўляў, «еўрапейскія краіны ўводзяць яшчэ больш жорсткія абмежаванні», — зазначыў кіраўнік МУС.

«Я за тое, каб днём цвярозасці аб’явілі і 4 сакавіка — Дзень міліцыі. Гэта было б правільна, мы самі павінны паказваць прыклад нашым грамадзянам».

**ЗП**

## Боты выдалі

**Добрасумленны ўчастковы з Салігорскага раёну раскрыў забойства кіроўцы і эканаміста калгасу, якія везлі ў гаспадарку заробак.**

Быў выклік на дом у сувязі са сваркай мужа і жонкі. І ўчастковы ўбачыў абутак, які супадаў з адбіткамі падэшваў зафіксаваных на месцы злачынства.

У выніку па справе арыштаваныя тры чалавекі. Адзін з іх пражываў з жанчынай, якая ведала працэдуру прывозу грошай.

**ЗП**

## У Мазыры знік без вестак 10-гадовы хлопчык

Мазырскі РАУС аб’явіў у вышук жыхара гораду 1998 году нараджэння, вучня 4-га класу гімназіі Руслана Харытончыка.

22 лютага прыкладна а 15.00 дзіця пайшло з дому і не вярнулася. Міліцыя вядзе вышук хлопчыка і просіць усіх грамадзян, якія яго бачылі або штосьці ведаюць аб месцазнаходжанні, паведаміць у органы ўнутраных справаў. Прыкметы зніклага без вестак: на выгляд 10 гадоў, рост 120 см, хударлявага целаскладу, вочы карыя, нос просты.

Быў апрануты: шэрая вязаная шапка з надпісам, джынсы блакітнага колеру, куртка чорная «Аляска», боты чорныя. Усіх, у каго ёсць інфармацыя аб месцазнаходжанні дзіцяці, просяць патэлефанаваць на нумар 8-02351-2-91-82 або на мабільны нумар МТС (029) 738-88-07.

**Алена Германовіч, БелаПАН**



## Падазроная смерць беларускага «злодзея ў законе»




**Выйшаўшы з турмы, беларускі крымінальны аўтарытэт «Біра», які трымаў у страху ўвесь Бабруйск, памёр ад сардэчнай недастатковасці.**

Смерць спаткала яго на кватэры. Мяркуецца, што «Біра» будзе пахаваны ў Бабруйску.

Уладзімір Бірукоў нарадзіўся ў 1963 г. у Бабруйску, быў адным з ініцыятараў стварэння бабруйскага «абшчаку». Ажыццяўляў кантроль за Бабруйскам. Быў «каранаваны» ў 1996 г. у Маскве.

Бірукоў выкарыстоўваў сувязі бацькі, які памёр у 1994 г. у Ізраілі. У спадчыну атрымаў невялікі завод, вілы, маторныя лодкі, значны капітал.

Яго групоўка аб’ядноўвала 300 актыўных сяброў. Банды ты кантралявалі гарадскія рынкі, абклалі данінай камерсантаў. У сферу інтарэсаў уваходзілі не толькі прыватнікі, але і дзяржпрадпрыемствы.

19 лютага Бірукоў быў затрыманы ў Маскве, але на наступны дзень адпушчаны на рашэнне пракурора.

Бірукоў падазраваўся ў тым, што цераз падстаўныя фірмы скупіў у Бабруйску больш за 10 аб’ектаў нерухомасці — дамы, рынкі, рамонтныя майстэрні.

**АГ**

## Хто мае спірт на працы — падымаецца

Пра дні цвярозасці.

У нас у Баранавічах дзень цвярозасці прайшоў 24 лютага! Таму ўсе абаронцы айчыны вельмі злосныя і шукаюць пахмяліцца дзе на кропках... У нас у вобласці ў лютым усе гарады мусяць правесці такі дзень. Не прадаюцца нават піва і джынтонік... То падымаюцца розныя кропкі і тыя, хто мае працоўны спірт...

**Іван Кавяра, Баранавічы**

## Для чаго дзень цвярозасці?

А ведаеце, я разумею, нашто ладзіць дні цвярозасці. Каб алкашы ведалі, як «херова» можа быць (бегай з хворай галавой, шукай бырла на пахмелку), і як добра цяпер — зайшоў сабе ў дзяржкраму, набыў бырла... Дні цвярозасці — гэта частка сацыяльнага кантракту з алкашамі — вельмі шматлікай сацыяльнай групай...

**Янка, Навагрудак**

## Пра зніжэнне тарыфаў мабільных аператараў

Я прапанаваў бы ўраду параіць Кіраўніцтву справамі прэзідэнта і Мінгарвыканкаму

знізіць таксама на 25% арэндную плату за нерухомасць.

А таксама бізнесоўцам — уладальнікам маршрутак, якія вырашылі пасля Новага году наварыць на бедных суайчынніках і задралі кошты праезду на 30%, таксама ўмерыць свае апетыты.

**Абазнаны, Мінск**

## Пра ЕГУ

Магістарскія праграмы БДУ нават блізка параўноўваць з магістарскімі програмі ЕГУ не выпадае.

У БДУ магістра́ — адзін год вучэння 5–7 дысцыплінаў, сярод якіх большасць — не па спецыяльнасці (інфарматыка з вардом, эксэлем і аксэсам, філасофія, педагогіка і псіхалогія, замежная мова + паратройка дысцыплін па спецыяльнасці з вельмі малой колькасцю гадзінаў).

У ЕГУ магістра́ — два гады вочна-дыстанцыйнай формы, з недзе 20 дысцыплінамі, якія непасрэдна датычацца спецыяльнасці, з больш эфектыўнымі формамі кантролю і адзнакі (эсэ, тэсты, прэзентацыі).

Магістра́ БДУ кажучы проста — г..о савецкае, магістра́ ЕГУ — адэкватная еўрапейская адукацыя другой ступені.

А наконт беларушчыны ў ЕГУ сапраўды праблема — асабліва на бакалаўрскіх прогах. Канечне, праблема агульнага становішча з мовай у Беларусіс прычыняецца, але і адміністрацыя ЕГУ не дужа беларусізацыі спрыяе. Усё пачынаецца з рэктара — хай Міхайлаў вывучыць беларускую мову ды на ёй робіць для студэнтаў рэгулярныя прамовы. А то сам рэктар ціпа беларускага універсітэту па-расійску заўжды гаворыць!

**Студыёзус ГуР**

## Ён закладаў асновы беларускай медыцыны

Сёлета спаўняецца 210 гадоў з дня нараджэння аднаго з першых тэрапеўтаў і педыятраў на тэрыторыі Беларусі Феліцыяна (Фелікса) Рымкевіча.

Ён нарадзіўся ў Магілёве ў 1799 годзе. У 1820 годзе закончыў вучобу ў Віленскім універсітэце, у якім у далейшым і працаваў. У наступным, 1821-м, годзе абараніў дысертацыю на тэму «Абсервацыя і эпікрызы хвароб, якія крупам завуцца». Праз пяць гадоў (у 1826 годзе) атрымаў званне прафесара універсітэту. На працягу 10 гадоў, з 1832 да 1842 году, выкладаў у Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, з 1834 году — у якасці ардынарнага прафесара.

Ф.Рымкевіч напісаў у 1830 годзе адну з першых на тэрыторыі Расійскай імперыі манаграфій пра халеру і спосабы барацьбы з ёю. У 1831 годзе ўдзельнічаў у стварэнні супрацьхалерных засланаў у Слуцку, Слоніме і Віцебску.

Ён выдаў больш за 40 навуковых прац па дыягностыцы хвароб сэрца, печані, дзіцячых хваробаў, у тым ліку і першую на тэрыторыі Расійскай імперыі працу пра аўскультацыю (выслухоўванне) сэрца і сасудаў (яна называлася «Аб прымяненні стэтаскопу (слухальнай трубкі) — метад даследавання хворых, які нядаўна прыдумалі і пачалі выкарыстоўваць у Францыі».

У 1832 годзе ў Вільні выйшла яго вучэбнае кіраўніцтва «Лекцыі па шпітальнай тэрапіі», якое было напісана, па тагачаснай завядзёнцы, па-лацінску. Акрамя таго, з'явіліся артыкулы Ф.Рымкевіча пра каўтун, глісты — хваробы, якія тады панавалі ў Вільні, а таксама пра хваробы сэрца пасля рэўматычнай гарачкі, венерычныя хваробы.

Пад кіраўніцтвам Ф.Рымкевіча было напісана каля 30 доктарскіх дысертацый.

Памёр Ф.Рымкевіч 17 снежня 1851 году.

**Генадзь Шэршань, Мінск**

## Я не маркоціўся

калі памёр Сталін.

Не ведаю, ці я такі ўрадзіўся, ці то само жыццё было такое, але я ўсе дырэктывы розных пленумаў, якія ўсе віталі, з малых гадоў сустракаў з недаверам. Можа, таму, што ўсе гэтыя пастановы, рашэнні мала закраналі нашу сям'ю, як і тысячы іншых беларускіх сем'яў.

Нашто ўжо смерць Сталіна ўскалыхнула ўсю Краіну Саветаў, але толькі не мяне і такіх, як я.

У сакавіку 1953 году мне было пятнаццаць. Я хадзіў у восьмы клас. Маім і такіх, як і я, штодзённым клопатам было забяспечваць сваё жытло дровамі. Кожнага божага дня пасля ўрокаў я браў у рукі саначкі,

Нам было не да жалобы. Як і мільёны сялян, мы змагаліся за выжыванне.

гукаў колькі яшчэ такіх, як я, небаракаў, і мы кіпалі па чэрава ў снезе ў лес. Лес той быў кіламетры за тры ад вёскі. Наладаваўшы ў лесе санны вазок дрывамі, накідвалі праз шыю на плечы якую вяроўчыну і валаклі, як бурлакі, тыя дровы ў вёску. Гэтак амаль кожнага дня.

У той дзень, калі паведамілі, што памёр правадыр усіх народаў, я таксама мусіў ехаць па дровы. А як жа! Тых дроваў, якія я прывозіў на сабе, хапала толькі на адзін раз. А хату трэба было абаграваць кожнага дня. Вяртаўся зморана, галаднаваты. Абветраны. Дык чаго мне было плакаць?! Чаго маркоціцца? Чаго самоціцца? У Маскве свае клопаты, а ў маіх мормальцаў свае.

Праўда, былі і сярод нас такія, што вельмі бедавалі з нагоды смерці правадыра: «Што будзе цяпер? Як без Сталіна жыць усім? Каб хоць бы вайны не было з нагоды смерці!»

Памятаецца, вельмі ўбівалася наша аднакласніца Юлька, дырэктарава ці то малодшая сястра, ці то дачка. Аблегшыся на парту, яна плакала наўзрыд. Юлька была прывабная. От яе слёзы краналі мяне! Але яна жыла трошкі ў іншых варунках, чым уся тутэйшая пасляваенная школьная галота, пасірацелая, паўгаладная школьная галота. То чаму Юльцы было і не пабедаваць! А нам што? Заўтра пасля школы зноў дровы! Зноў саначкі ў рукі — і ў лес пні шчапаць.

Зноў думай, дзе раздабыць што з'есці, як дзень прахарчавацца...

Гэтымі днямі прачытаў, нібыта Сталін памёр яшчэ ў 1947 годзе. А за яго быў ягоны двайнік. Гэта яшчэ больш пераканала, што маё падлеткавае раўнадушша ў 1953 годзе было апраўдана, і яно было не толькі інтуітыўнае, але і сацыяльнае.

**Уладзімір Содаль**

## У стылі «нью»

*«Газета «Спортивная панорама» ў савецкіх традыцыях раскрытыкавала баскетбалістку Святлану Троіну. Прычынай стала тое, што зорка нацыянальнай зборнай распранулася перад фотакамерай. Сесія аўтарства мастачкі Таццяны Уласавай з'явілася ў газеце «Прессбол».*

***«Наша Ніва»***

Рэдактара «Спортивной панорамы»
Газеты роднай
Турбаваў тыраж.
Настрой ягоны
Быў не лепшы самы:
Малы тыраж —
Ну хоць касцямі ляж.
Затое канкурэнтная газета
У чытачоў, як кажуць, нарасхват.
У чым сакрэт?
Як растлумачыць гэта?
Не большы ж у яе, здаецца, штат,
У журналістаў
Тыя ж і заробкі,
І ўмовы працы:
Ёсць кампутар, стол...
Рэдактар
Захацеў «расставіць кропкі»
І канкурэнта вывучыць —
«Прессбол».
Карпеў рэдактар доўга
Над «Прессболом»...
Зрабіў, нарэшце,
Вывады свае:
«Увесь сакрэт у тым,
Што дзеўкам голым
Газета перавагу аддае.
Як у «Плэйбоі» —
Першая старонка
(Такую
Мы ніколі б не далі!):
Панадлівая дзеўка-чэмпіёнка
«На цыцкі пачапіла»
Медалі.
І мужыкі,
Нібыта стрыптызёры, —
Азадкі загаляюцца з палос.
Хіба б у нас на здымку
Быў каторы? —
«Прессболом» тым
Рэдактар злосна трос. —
Не дам я,
Каб спартыўныя навіны
Даводзіліся ў нас
У стылі «нью».
Аберагаць цнатлівасць мы павінны!
Маральную захоўваць чысціню!»
Было здзіўленне
У калег на тварах.
Рэдактар іх прыбіў,
Нібы цвіком:
— Здымаць усіх дзявок
У шараварах,
А мужыкоў-спартсменаў —
У трыко!
Не трэба кпінаў!
І смяяцца рана!
І прытрымайце
Гнеўны гул і свіст.
Не так даўно
Ад мусульман Ірану
Рэдактар атрымаў
Падзячны ліст.

***

Газета «голай»
Можа быць таксама...
І я, чытач, нікольці не зманю:
«Спортивная», так мовіць, «панорама»
Сябе ж
І паказала ў стылі «нью»...

**Алесь Няўвесь, Мінск**

## Лягушкі і жабы

Паважаныя, пазнаёміўся я тут неяк з адным з нядаўніх нумароў вашай газеты. Калі архаічны правапіс вы нарэшце, дзякуй богу, пакінулі ў спакоі, то ад вашай звышбеларускай лексікі, здаецца, стала каробіць яшчэ болей, чым некалі. Можа, гэта з таго, што надта выпіраюць яе дзівацтвы і недарэчнасці на фоне звыклага і натуральнага для нармальных беларусаў сучаснага правапісу. У сваім неўтаймавальным памкненні адрафінаваць беларускую мову вы з сваёй невялікай кампаніяй даходзіце, на жаль, нават да невуцтва.

Скажыце, які гэта такі разумнік дадумаўся (я пра гутарку ў № 6 з артысткай Г.Хітрык, дзе згадваецца казка «Царэўна-жабка»), што лягушка па-беларуску, гэта жаба? Лягушкі і жабы — гэта і па-расійску, і па-беларуску адрозныя жывёлы, якія належаць да розных біялагічных родаў (на навуковай лаціцы адпаведна Rana і Bufo) і, нават, сямействаў (Ranidae і Bufonidae) амфібій.

**А.Фралоў, кандыдат біялагічных навук**

**Ад Рэдакцыі.** Шаноўны спадару Фралоў!

У гэтым пытанні Вы памыляецеся. Паводле нарматыўных слоўнікаў савецкага часу рас. «жаба» гэта «рапуха» або «жаба», а рас. «лягушка» гэта «жаба». Слова «лягушка» ў 5-томавым слоўніку бел. мовы пад рэд. Крапівы пазначана паметай «абласное». «НН» стараецца захоўваць усё лексічнае багацце. Яно таксама важна для мовы — як захаванне кожнага віду для захавання біялагічнае разнастайнасці.

**Ваша, «НН»**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Масленіца ў Музеі народнай архітэктуры ў Строчыцах.**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**В. з Мінску.** Добры артыкул пра Яўгенію Пфляўмбаўм знойдзеце ў кнізе Уладзіміра Арлова «Імёны Свабоды».

**Кастусю Ч. з Пінску.** Больш за эсэістычныя замалёўкі цікавыя нам сёння навіны. Пішыце, што ў вас робіцца ў Пінску.

**Івану Я. з Мінску, Зоі Ж. з Гродна.** Дзякуй, вершы атрымалі.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Вышэй Сцяг!

Як быў створаны бел-чырвона-белы сцяг? Піша **Сяргей Харэўскі**.

Постаць гэтага чалавека не ўкладаецца ў шаблонныя схемы беларушчыны. Ён не меў ніякага дачынення да БССР, а з міжваеннае Вільні мусіў з'ехаць яшчэ ў 1921 годзе.

Клаўдзій Дуж-Душэўскі нарадзіўся ў 1891 г. у Глыбокім. Яшчэ маладым ён далучыўся да нацыянальнага руху — праз «Нашу Ніву» і тэатр Буйніцкага. Менавіта Дуж-Душэўскаму даручылі сыграць ролю Крыніцкага падчас прэм'еры Купалавай «Паўлінкі».

У 1912 ён паступіў у элітны Горны інстытут у Пецярбургу. Там, у сталіцы імперыі, ён стаў заўзятым актывістам Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэту. Тамсама ён спрычыніўся да выдання часопісу «Раніца». Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917-га ўступіў у Беларускую Сацыялістычную Грамаду. Удзельнічаў у з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацыяў у сакавіку 1917-га ў Менску, ва Усерасійскай дэмакратычнай нарадзе ў Петраградзе. Самааддана працаваў на розных афіцыйных і неафіцыйных пасадах, але перадусім мы будзем памятаць і шанаваць Душэўскага за тое, што менавіта ён стварыў узор Беларускага Сцяга.

Большасць сцягоў свету была створаная на мяжы XIX і XX стст. І ў кожнага з іх быў свой аўтар. Напрыклад, Мсціслаў Дабужынскі стварыў сённяшні сцяг Літвы.

Напрадвесні свае дзяржаўнасці, да 1917 году, беларусы пэўна ведалі, што іхні знак — белая Пагоня на чырвоным тле. Аднак эталону Сцяга не існавала. Існавалі паданні, існавала народная семантыка арнаменту.

Бел-чырвона-белыя кукарды і стужачкі на фуражках насілі студэнты-беларусы ў Пецярбургу яшчэ да 1915 году. У гэтыя ж колеры спалучаліся розныя ўрачыстыя аздобы, сімвалізуючы ў стылізацыі народны арнамент.

У часе Лютаўскае рэвалюцыі беларусы паслугаваліся простым белым сцягам, на якім змяшчалі лозунгі. Аднак неўзабаве пытанне пра ўласны Сцяг паўстала рубам. За сябе сведчыць сам Дуж-Душэўскі ва ўспамінах у 1934 годзе: «*Цікава адзначыць, што беларусы ўважалі сваім дзяржаўным гербам той, што і літоўцы, гэта значыць, белую Пагоню на чырвоным полі, але нацыянальнага сцяга не было. Мне давялося зрабіць некалькі праектаў нацыянальнага сцяга, і адзін з іх быў прыняты, менавіта: бела-чырвона-белы. Ад таго часу гэты сцяг і лічыцца за беларускі*».

Гэты сцяг увесну 1917 году залунаў на будынку Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны ў Пецярбургу. Дарэчы, Дуж-Душэўскі быў супрацоўнікам гэтага таварыства з 1916 па 1918 год. Упершыню наш Сцяг залунаў у сталіцы падбітай імперыі. Адначасова Сцяг рушыў у Беларусь. Дакладна, 12 сакавіка 1917 году. У гэты дзень у Менску адбылося масавае свята — Дзень беларускага значка. У гэты дзень бела-чырвона-белыя значкі, кукарды і сцяжкі можна было пабачыць паўсюль на вуліцах. Сцягі, пашытыя паводле эскізу Дуж-Душэўскага, былі разасланыя ў мясцовыя арганізацыі. Радаслаў Астроўскі сведчыў, што ён асабіста атрымаў Сцяг у траўні 1917-га ў Слуцку, дзе ў той час працаваў. На



**Клаўдзій Дуж-Душэўскі. Малюнак Пётры Сергіевіча. 1940 г.**

тым Сцягу было вышыта золатам: «Няхай жыве вольная Беларусь!». У снежні 1917 году ў Менску падчас Усебеларускага з'езду бел-чырвона-белы сцяг ужо ўважаўся за нацыянальны сімвал Беларусі...

На вялікі жаль, дакладная дата яго зацверджання даследнікамі яшчэ не выяўленая. Аднак у 1917 годзе ў «Статуце Беларускіх Нацыянальных Культурна-Прасветных Гурткоў у войску» перадапошні пункт у загадным парадку паведамляў: «*Кожын член беларускай грамады ў войску павінен насіць беларускі нацыянальны знак — белая стужка з чырвонай палоскай пасярэдзіне; усе тры палоскі — белая, чырвоная і белая — аднэй шырыні*».

На дзіва, усе помнікі Менску, звязаныя з той эпохаю, ацалелі. Гэта і славуты гарадскі тэатр, дзе 7 снежня 1917 году трыумфаваў Усебеларускі з'езд, і будынак чыгуначнага дэпо, куды перабралася Рада Усебеларускага з'езду, і будынак былога Царкоўна-археалагічнага музею, у якім была абвешчаная БНР, і былы губернатарскі палац, дзе засядаў Народны сакратарыят (цяпер — музычная школа пры Кансерваторыі на Плацы Свабоды).

Менавіта гэта і ёсць першы будынак у Менску, над якім вольна залунаў наш сімвал Волі. Гэта быў дзень уцёкаў бальшавікоў з Менску — 19 лютага 1918 году. Сцяг быў зняты з гэтага будынку кайзэраўскімі вайскоўцамі. Пра гэта, дарэчы, з не надта ўцямнай радасцю шматкроць паведамлялі савецкія гісторыкі. Ужо ў кастрычніку 1918-га ў менскім часопісе «Варта» быў змешчаны славуты здымак былога губернатарскага палацу, на балконе якога лунае бел-чырвона-белы сцяг.

На ўлётцы культурна-асветніцкай арганізацыі «Беларускі гай», што была ўтвораная ў снежні 1917 году ў Адэсе пры Беларускай Вайсковай Радзе Румынскага Фронту, дзе і з'явіўся гэты цікавы дакумент, сцяг надрукаваны, дарэчы, чырвонаю фарбаю. Ахайны бел-чырвона-белы аркушык... Красамоўным сведчаннем легітымнасці нашага сцяга ёсць яго вывы на гэтай ўлётцы, дзе яны аздабляюць заклік: «*Братья-Белорусы, объединяйтесь!*». Сам тэкст выдрукаваны па-расійску, што ў пэўнай ступені лагічна ў тыя гады і ў тым месцы.

Душэўскі не памыліўся ў выбары колераў.

Сцяг адразу прыжыўся, яго прынялі як свой.

Гісторык Вацлаў Ластоўскі пісаў: «*Белыя нагавіцы, белая кашуля, белая світка, падперазаная чырвоным паясом — вось сільвэтка беларуса. Зразумела, што і нацыянальны сцяг беларусаў бел-чырвона-белы. Ён прыгадвае нам нашую белую світку з чырвоным паясом*».

Адзін з лідэраў беларускіх эсэраў Тамаш Грыб даваў больш паэтычны тлумачэнні: «*Белая барва, як уяўленне святла, вельмі пашыраная на Беларусі, зэтуль, мабыць, паходзіць і назва Беларусі — белая, чыстая, вольная, як свет сонца. Не менш пашыраная ёсць на Беларусі і чырвоная барва, як чырвоны ёсць золак на небе перад узыходам сонца; таму наш бел-чырвона-белы сцяг — сцяг адраджэння і вызвалення беларускага народу*».



**Праект манумента Незалежнасці Літвы ў Акмяне, работы К.Дуж-Душэўскага. 1929 г.**

У 1918 Клаўдзій Дуж-Душэўскі працаваў загадчыкам бежанскага аддзелу Беларускага нацыянальнага камісарыяту. Ён адназначна ўхваліў абвяшчэнне незалежнасці Беларускае Народнае Рэспублікі. У той час ён займаўся багата якімі справамі — ад выкладчыка Віленскай беларускай гімназіі да дыпламатычнага прадстаўніка Беларускай Народнай Рэспублікі ў краінах Балтыі і дзяржаўнага сакратара ва ўрадзе БНР.



**Мітынг на Саборнай плошчы ў Менску. 1917—1918-я. Добра бачны палац губернатара (на фоне Катэдры), над якім у 1918-м упершыню ў Беларусі ўздымецца нацыянальны сцяг.**

З красавіка 1919 Душэўскі жыў у Вільні: у траўні яго абралі старшынём Цэнтральнае Беларускае Рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны, але праз нязгоду з прапольскай арыентацыяй большасці рады ў ліпені склаў з сябе гэтыя паўнамоцтвы; з ліпеня ўзначальваў камітэт Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны.

У пачатку 1921 году польскія ўлады арыштоўваюць яго. Калі ўдаецца выйсці на волю, ён эмігруе ў Літву. Архітэктар Дуж-Душэўскі, які падпісваў свае праекты і малюнкі «Klod», а лісты да Антона Луцкевіча «Клаўдыя», ідзе на працу ў Міністэрства замежных справаў, потым у Міністэрства сувязі Літвы.

Як архітэктар Дуж-Душэўскі пабудаваў у міжваенным часе дзесяткі будынкаў у Коўне, Расейнах, Панявежы, Клайпедзе, Шаўлях. Гэта і паштамты, і фабрыкі, і радыёстанцыі, і асабнякі... Многія з іх ён стварыў у творчай садружнасці з выдатным скульптарам Ёзасам Зікарасам. Пэўны час ён супрацоўнічаў з выдатным дойлідам Уладзімірам Дубянецкім.

Увадначассе Душэўскі браў удзел у беларускім жыцці, быў кіраўніком Беларуска-Літоўскага таварыства, рэдагаваў часопісы «Беларускі сцяг», «Беларускі асяродак» і «Крывіч», на старонках якога з'явіліся ягоныя «Матэматычны слоўнік» ды «Расійска-беларускі і беларуска-расійскі слоўнік геаметрычных і трыганаметрычных тэрмінаў». Перакладаў на беларускую мову і выдаваў падручнікі для сярэдніх школ. Збіраў матэрыялы да «Беларускага зельніка» і да «Наменклатуры беларускіх птушак».

Пасля акупацыі Літвы чырвонымі войскамі архітэктар Дуж-Душэўскі як старшыня Беларускага цэнтру ў Коўне трапіў у савецкую турму, дзе правёў амаль год — да чэрвеня 1941. У жніўні 1943 году яго арыштавалі ўжо гітлерцы за дапамогу габрэям і адправілі ў канцлагер блізу мястэчка Правянішкі.

Адразу па вайне Клаўдзій Дуж-Душэўскі стаў дацэнтам Каўнаскага ўніверсітэту. Але ўжо ў снежні 1946-га яго зноў на паўгоду кідаюць у турму. Чацверты арышт — у лютым 1952 году. На гэты раз яго як «актыўнага беларускага нацыяналіста» засуджваюць да зняволення на 25 гадоў. Вызвалены ў красавіку 1955. Працаваў у інстытуце «Літбудпраект». Паводле ягоных праектаў па-ранейшаму будаваліся многія важныя аб'екты ў Літве. Сярод іншага — славутая шакаладная фабрыка Pergale. Дарэшты стомлены жыццём і змаганнем, ён памёр напрадвесні 1959 году.

Клаўдзій Дуж-Душэўскі быў пахаваны ў любым яму Коўне. На помніку ягоным усталяваны барэльеф з ягоным партрэтам, працы славутага літоўскага скульптара Ёзаса Зікараса.

А ўсяго праз тры дзесяцігоддзі пасля яго смерці бел-чырвона-белы сцяг залунаў над мінскім Домам ураду...




**«Беларускі нацыянальны штандар». Паштоўка часоў БНР.**

### Беларуская салідарнасць

На прыкладзе стасункаў К.Дуж-Душэўскага і А.Луцкевіча можна пабачыць, як мае працаваць беларуская салідарнасць. Дуж-Душэўскі быў ад гімназічных гадоў узгадаваны «Нашай Нівай», уваходзіў у ЦК Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Аднак пасля яе расколу сышоў да эсэраў. Уваходзіў ва ўрад БНР, ачолены В.Ластоўскім, які выказаў недавер прэм'еру А.Луцкевічу. То што: яны з Луцкевічам смяротныя ворагі? Зусім не. Мала хто ведае, што рукапісы Купалавых шэдэўраў «Сон на кургане» і «Паўлінка» захоўваў К.Дуж-Душэўскі. А пасля перадаў у Беларускі музей у Вільні. Прыняў жа — дырэктар музея А.Луцкевіч.

Пазбаўлены ў 1931 г. права выкладаць у Віленскай беларускай гімназіі, бацька двух сыноў, А. Луцкевіч «проста галадаў». На дапамогу прыйшлі літоўскія беларусы, якія жылі пераважна ў Коўне і лідэрам якіх стаў Дуж-Душэўскі. Пра гэта кажа нам ліст Дуж-Душэўскага да Луцкевіча, напісаны 2 лютага 1939 г.: «Даражэнькі Антоне. Мне, як беларусу, дужа цяжка адчуваць, што я тутака ў Літве карыстаюся нармальнымі ўмовамі жыцця і заработку, а Ты, які аддаеш усе свае сілы і час нашай агульнай культурнай рабоце, г. зн. музею, прымушаны цягнуць сваё жыццё на палову галоднае. Пасылаючы музею штомесяц 400 літаў, думаю, што мы, г. зн. сябры музею, павінны Табе плаціць мінімум хоць 250 літаў у месяц. ...Мне дужа прыемна хоць гэтым маленькім узносам палегчыць становішча нашага музею». Пасля арышту А. Луцкевіча ў 1939 г. Дуж-Душэўскі не пакінуў без помачы яго сям'ю, матэрыяльна дапамагаў яго сынам.

**АС**

# Ілля Стогаў: Крызіс — нагода пачаць проста жыць

**Знаны расійскі пісьменнік пра сучасную літаратуру, Лукашэнку, пуцінізм, беларускі каталіцызм і стратэгіі паводзінаў у часы эканамічнага краху ў інтэрв'ю, якое ў «Советской Белоруссии» парэзалі.**



З расійскім пісьменнікам і журналістам Іллём Стогавым я пазнаёміўся пры даволі дзіўных акалічнасцях. Улетку 2006 году мне патэлефанавала сяброўка маёй жонкі, што займалася размяшчэннем на начлег паломнікаў, якія прыбываюць з Расіі ў Будслаў, і тонам, што не дапускаў пярэчанняў, заявіла: «Сярод пілігрымаў ёсць скандальны пісьменнік Стогаў; думаю, вы з ім паразумеецеся».

Да свайго сораму, я чуць не чуў пра такога літаратара (гэта да пытання пра тое, наколькі добра мы ведаем сваіх суседзяў). Не, вядома, я ведаў Сарокіна, Пялевіна, Талстую і нават Ксенію Сабчак, але Стогаў? Рэфлексіўна палез у Вікіпедыю і аслупянеў: больш за 20 кніг, журналіст году (1999), прэмія «Найлепшы кніжны праект году» (2001) за раман «Мачо не плачуць», тэлепраграма «Тыдзень у Вялікім Горадзе» прызнаная найлепшым забаўляльным праектам СНД на Еўразійскім тэлефоруме ў 2005 годзе.

Узяў у сяброўкі раман «mASIAfucker» і пагадзіўся з крытыкам італьянскай версіі моднага мужчынскага часопісу «GQ»: «Стогаў — адзіны расійскі аўтар, які піша на ўзроўні класікаў еўрапейскай контркультуры». Пасля гэтага я купіў і прачытаў усе даступныя ў Мінску кнігі Іллі, сярод якіх асабліва хачу вылучыць «Сківіцу Адама», «Пакуты Хрыстовы», «Мёртвыя могуць танчыць», «1999. Раман у стылі тэхна» і нядаўна выдадзены «Апакаліпсіс учора. Дзённік кругасветнага вандравання» — напісаная ў дакрызісныя часы кніга, на старонках якой выразна бачны грозны цень будучых узрушэнняў. Ніжэйзгаданае інтэрв'ю я рыхтаваў для паважанай мною «Советской Белоруссии», і таму імкнуўся зрабіць яго максімальна паліткарэктным, але і гэтая асцярога не зберагла тэкст ад сур'ёзнага скарачэння. Мне ж здаецца, што адказы Іллі заслугоўваюць таго, каб быць пачутымі беларускім грамадствам. Вось чаму я наважыўся апублікаваць поўны варыянт маёй гутаркі з гэтым адкрытым чалавекам у «НН».

**— Відавочна, што пісьменнікі даўно ўжо не з'яўляюцца пракамі, уладарамі думак і кумірамі моладзі.**

— Чаму?

Для кагосьці з'яўляюцца, — і прарокамі, і ўладарамі. Толькі цяпер не для ўсяго грамадства, а для невялікіх групаў.

Хтосьці і сёння даведваецца пра будову свету з касмічных операў. Для кагосьці стымул дзеяння — аповеды Лімонава. Даволі і такіх, для каго ісціна ў апошняй інстанцыі — гэта «рублёўская» проза, тыпу Робскі альбо Мінаева. Сам я, у прынцыпе, вельмі нелюдзімы чалавек і рэдка маю зносіны са староннімі людзьмі. Але нават мне не радзей чым раз на месяц задаюць пытанне — як нам уладкаваць Расію. А ўжо парадаў на тэму, што рабіць, калі кінуў хлопец (дзяўчына), просяць і наагул праз дзень. Або вось: у Маскве прадаюцца футболкі з маім абліччам — чым я пасля гэтага не рок-зорка?

**— Як Вы прыйшлі ў літаратуру? Чаму і навошта займаецеся гэтым?**

— Я не стаў бы зваць тое, чым займаюся, гэтак пафасна. Усё-ткі паводле асноўнай прафесіі я хутчэй журналіст. Мне цікава глядзець на свет і потым апавядаць пра тое, што бачыў, навакольнае. За апошнія тры-чатыры гады я апублікаваў пару кніжак пра сучасных музыкаў, расследаванне злачынстваў самай вядомай расійскай скін-банды, дакументальныя раманы аб прафесійных баксёрах, палярных паляўнічых і порна-зорках, а таксама дзённік уласнай кругасветнай вандроўкі. Усё гэта разам наўрад ці цягне на назву «літаратура».

**— Што Вы думаеце пра сучасную расійскую літаратуру як чытач чужых тэкстаў?**

— Узровень сучаснай расійскай прозы не надта адрозніваецца ад узроўню надпісаў у прыбіральні для хлопчыкаў.

Нават яе найвышэйшыя ўзлёты, тыпу Пялевіна, на жаль, глыбока другасныя і правінцыйныя.

Рэдка, вельмі рэдка, ад сілы раздва ў дзесяцігоддзе, з'явіцца нешта на самай справе цікавае. Гэта, дарэчы, прычына таго, чаму сам я аддаю перавагу ўсё-ткі журналістыцы. Мець хоць нешта супольнае з гэтым бандустанам мне зусім не хочацца.

Іншая справа, што Расія — краіна, як вядома, бязмежная. І расійская літаратура — гэта не абавязкова літаратура расійцаў.

Апошнім часам я з велізарным задавальненнем чытаю ханты-мансійскіх, чукоцкіх або эрзянскіх пісьменнікаў. Вось дзе сапраўдны нерв расійскамоўнай прозы!

Вось дзе россыпы сапраўдных дыяментаў!

**— У адным з сваіх інтэрв'ю Вы назвалі Уладзіміра Караткевіча беларускім Умбэрта Эка і сказалі, што ягоная творчасць застаецца дагэтуль недаацэненай.**

— Караткевіч нават лепшы за Эка. І заслугоўвае экранізацыі ў Галівудзе больш, чым які-небудзь Зюскінд. Шкада, што ў Расіі гэты аўтар вядомы меней, чым, скажам, нігерыец Амос Тутуола. Наколькі я ведаю, тамака нейкая вельмі складаная сітуацыя са спадкаемцамі, і публікаваць Караткевіча ніхто не бярэцца.

**— Хто яшчэ з нашых пісьменнікаў, музыкаў, рэжысёраў цікавы для Вас?**

— А я, акрамя Караткевіча і «Ляпіса Трубяцкога», нікога ўвогуле не ведаю. «Ляпіс» цікавы, нават вельмі. Думаю, што гэта ці не адзіны расійскамоўны гурт цалкам еўрапейскага ўзроўню.

І ужо сапраўды адзіны не-пецярбургскі, які ў маім снабісцкім горадзе могуць прымаць ВОСЬ ТАК. За апошнія два гады я бачыў чатыры іх канцэрты, прычым апошні ўсяго пару тыдняў таму (хадзіў з малодшым сынам). Квіткі каштавалі шалёна дорага, а на вуліцы стаяў жудасны мароз. Але здаравенны клуб на паўтары тысячы месцаў ледзь не лопнуў — гэтулькі напакавалася народу.

**— Ці захаваліся ў Вас якія-небудзь успаміны савецкіх часоў пра Беларусь? Як змянялася ўспрыманне Беларусі цягам часу і ці сфармавалася ў Вас на сённяшні дзень якое-небудзь уяўленне пра людзей і краіну?**

— У савецкія часы я не ўяўляў нават, дзе гэта. Разумееце, Пецярбург, у якім я нарадзіўся, — гэта такі горад, які замяняе яго жыхарам увесь астатні свет. Так што асабіста я ўпершыню пабываў у вас у краіне толькі ў 1993-м. Тады я толькі-толькі прыняў хрост ў Каталіцкай царкве і выправіўся ў паломніцтва ў Магілёў.

Ад краіны засталося змешанае адчуванне вельмі савецкага фасаду і вельмі напышлівага нацыяналізму — даведаўшыся пра тое, што я з Расіі, адны мясцовыя паломнікі кідаліся ад мяне як ад пракажонага, тады як іншыя ўпарта прапаноўвалі перайсці на ангельскую. Ад першага я да таго часу паспеў адвыкнуць, а прычыны другога не разумеў. Сёння ўсё, вядома, змянілася: нейкія савецкія штучкі вярнуліся, наадварот, у расійскае жыццё, а калі таксісты ў Мінску, даведаўшыся, адкуль я, пачынаюць чытаць лекцыю пра Вялікае Княства Літоўскае, я больш не крыўлюся, а матаю на вус.

**— Што з убачанага ўразіла, што падалося цікавым?**

— Беларусь для расійцаў — гэта заблізка, каб быць замежжам, але адначасова занадта іншае, каб здавацца Расіяй. У вас вельмі маленькая краіна, але гэта ўсё-ткі краіна. Не тое, да чаго я звык дома. На захадзе Беларусі, у каталіцкіх краях, гэта адчуваецца асабліва. У Расіі ўсім выдатна вядома, што, скажам, царква або галоўная партыя можа быць толькі адна. Але вось у беларусаў велізарны адсотак насельніцтва не з'яўляецца праваслаўным, і гэта не расколвае канструкцыю, а наадварот, робіць яе больш разнастайнай, а значыць, устойлівейшай.

**— Ці адрозніваецца вобраз Беларусі, створаны расійскімі СМІ, ад убачанага ўласнымі вачыма падчас наведванняў нашай краіны?**

— Сапраўды скажу: расійскія газеты або ТБ практычна не цікавяцца вашай краінай. Пра Беларусь сярэдні расіец не ведае амаль нічога. Дзесяць гадоў назад аблічча вашага прэзідэнта ўспрымалася як альтэрнатыва шляху, якім ішоў Ельцын. У Расіі дзеялася чорт ведае што, затое (глядзіце!) у беларусаў парадак. А цяпер Пуцін пералукашэніў Лукашэнку па ўсіх параметрах і пра Беларусь расійскае ТБ забылася.

Цяпер альтэрнатывай з'яўляецца Украіна: у Расіі павіс задушлівы парадак, затое глядзіце, як усё весела ва ўкраінцаў!

**— Вы нядаўна неяк непахвальна згадалі расійскую палітычную апазіцыю: «гэта не Пуцін дыктатар, гэта вы ідыёты». Чым выклікана такое рэзкае выказванне?**

— Можа быць, я памыляюся, але гледзячы з Расіі мне ўсё-ткі здаецца, што беларуская апазіцыя выказвае інтэрасы пэўнай часткі вашага насельніцтва. А вось у Расіі гэта зусім не так. У нас апазіцыя не выказвае нічога, акрамя ўласнага жадання самой стаць уладай і ўжо тут усім паказаць, дзе ракі зімуюць. Уся яе палітычная праграма зводзіцца да фразы: «А каб вы тамака наверсе ўсе, сукі, здохлі!» Апазіцыяй у Расіі завуць тых, хто выдатна жыў пры Ельцыне і хацеў бы, каб гэтыя часы вярнуліся, плюс нейкую колькасць відавочна звар'яцелых. Мне не вельмі падабаецца цяперашняя ўлада. Калі казаць адкрыта, то яна мне зусім не падабаецца. Але сучасная расійская апазіцыя стварае ў мяне ўражанне поўнага дурдому.

**— Ці не было следам за такімі заявамі абвінавачванняў у Вашай пракрамлёўскай пазіцыі?**

— Хлопца з маёй рэпутацыяй неразумна падазраваць у жаданні падабацца ўладам.

**— Мяркуючы па Вашай апошняй кнізе «Апакаліпсіс учора», сусветны фінансавы крызіс не стаў для Вас нечаканасцю.**

— На жаль, стаў. Можна колькі заўгодна енчыць пра будучы апакаліпсіс, але калі амаль у сорак гадоў ты застаешся наагул без крыніцаў існавання, гэта ў любым разе непрыемная нечаканасць.

Усё жыццё я быў бедным, але такім бедным, як сёння, не быў, мусіць, ужо гадоў дзесяць.

Я прапаноўваў жонцы з'ехаць у Індыю, параседзець крызіс тамака. У Расіі, калі так пойдзе, мне хутка давядзецца ісці на курсы кіроўцаў тралейбусаў або бульдазерыстаў.

**— Ці згодныя Вы з меркаваннем нямецкага журналіста і пісьменніка, аўтара выдатнай кнігі «Мастацтва стыльнай беднасці» Аляксандра фон Шэнбурга пра тое, што крызіс дапаможа людзям пераасэнсаваць і прыняць такія паняцці, як каханне, літасць, сяброўства, сям'я, сумленнасць, прыстойнасць?**

— Раўніва падціснуўшы вусны, скажу, што ніколі не чуў пра такога пісьменніка. І наагул быў упэўнены, што гэтая фраза належыць мне.

З тых часоў, як пачаўся крызіс і грошы мае скончыліся, я на кожным скрыжаванні толькі і крычу пра радасці беднасці: калі ты пазбаўлены неабходнасці сутаргава зарабляць усе грошы свету, ты можаш нарэшце проста пачаць жыць.

Не гандляваца, а размаўляць. Не грэбці пад сябе, а дарыць усмешкі. Тое, што ні ў каго з нас сёння няма грошай, гэта, вядома, дрэнна, але толькі гэта і робіць нас людзьмі, — і гэта добра.

**— Што ўвогуле Вас цешыць, дае надзею, сілы?**

— Ды ўсё цешыць! З гэтым крызісам я быццам зноў стаў на дваццаць гадоў маладзейшым. Грошай няма, даляглядаў ніякіх, затое кожны дзень — прыгода. Як раздзел яшчэ не напісанай кнігі. Усё зноў стала магчымым. Можа быць, я ўсё-ткі з'еду жыць у сваю Індыю. А можа, не ў Індыю, а ў Крым. Або, скажам, у Харватыю — тамака мора, каталіцкая краіна і жыць танна. А можа, не стану з'язджаць, а плюну на свае прынцыпы і напішу раман. Або, наадварот, памру. Або падамся ў тэлевядоўцы. Або зраблю сабе татуіроўку на ілбе, каб мяне ніколі і блізка не падпусцілі да ТБ. Я ж кажу: усё магчыма і ўсё цешыць. Як бы жыццё ні павярнулася, я думаю, гэта будзе добрае жыццё. Мне казалі, бойся бяды, нагадвалі, што няма надзеі, але памятаю я — цела галоўней за ежу, а жыццё важней за адзежы».

**Валеры Краснагір**

# Апублікаваны «Мемарыял Вітаўта»



Гэта унікальная пісьмовая крыніца па гісторыі ВКЛ XIV ст. Пераклад дакументу пабачыў свет на старонках часопісу «Беларуская думка» (№2'2009). «Мемарыял Вітаўта» датуецца 1390 г. Князь Вітаўт узняў тады паўстанне супраць стрыечнага брата, караля Польшчы, вялікага князя літоўскага Ягайлы. Збегшы ў Прусію, Вітаўт вымушаны быў патлумачыць магістру Тэўтонскага ордэну сваю палітыку і распавесці пра многія таямніцы гісторыі Вялікага Княства. Гэтая прамова запісаная пісарам крыжакоў на старажытнай нямецкай мове. Дагэтуль ён перакладаўся толькі на польскую і літоўскую мову.

# Сукачоў спыніў канцэрт у Мінску, баронячы гледачоў ад амону

Вядомы музыка быў здзіўлены парадкамі ў мінскім Палацы Рэспублікі.

1 сакавіка ў мінскім Палацы Рэспублікі прайшоў канцэрт найпапулярнейшага расійскага рок-музыкі Гарыка Сукачова і гурту «Неприкасаемые». Нягледзячы на высокі кошт квіткоў (ад 50 да 100 даляраў) не ўсе гледачы змаглі патрапіць у залу. На прыступках канцэртнай залы людзі актыўна пыталіся пра «лішні квіточак».

Канцэрты ў Палацы Рэспублікі адрозніваюцца «акадэмізмам», адзначае сайт charter97.org. Ахова традыцыйна цвёрда спыняе спробы гледачоў танчыць. Таму першыя некалькі песень мінскія гледачы слухалі як сімфонію Вагнэра, што выклікала крайнюю ступень здзіўлення Сукачова, які адзначыў: «Падобна, што тут сабраліся людзі, якія працуюць выключна стоячы».

Музыка заклікаў гледачоў быць больш непасрэднымі. Але першых некалькіх «герояў», што паспрабавалі прайсці да сцэны і танчыць у праходах, сурова сустрэла ахова. Гарык запатрабаваў уключыць у зале святло і паспрабаваў запаліць публіку сваімі хітамі «О чём поёт гитара», «Белла, чао!». Зала паволі стала ажываць, а падчас выканання хіта «Я милого узнаю по походке» з месцаў ужо ўсталі ўсе гледачы.

Ахова цвёрда душыла спробы гледачоў танчыць каля сцэны, а падчас выканання «падрыўной» песні «Моя бабушка курит трубку» магутны амапавец спрабаваў вывесці аднаго з гледачоў. І тады Сукачоў спыніў песню і заявіў: «Кінце «вязаць» народ. Інакш мы іграць не будзем. Не блытайце весялосць з дэманстрацыяй пратэсту, — звярнуўся ён да аховы Палацу і амапу. — Барыкады тут не пачнуцца».



Зала зараўла ад захаплення. Чалавека адпусцілі, і далей канцэрт ужо праходзіў у нармальным рок-рэжыме.

Пасля канцэрту адміністрацыя Палацу Рэспублікі патлумачыла Сукачову дзеянні аховы тым, што перад сцэнай знаходзіцца аркестровая яма. Насціл, які яе закрывае, можа вытрымаць танцы не больш як двух сот чалавек. Таму ахова так імпэтна адганяла ад сцэны фанатаў. Сукачоў нават асабіста праінспектаваў аркестровую яму.

**СМ**

КАМЕНТАР

# Даручэнне выканана!

Нарэшце, дачакаліся… Пакуль не бронзавага помніка ў поўны рост, а толькі бронзавага барэльефа.

«Будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, пабудаваны ў 1939 годзе паводле праекту архітэктара Лангбарда І.Р. і рэканструяваны ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Лукашэнка А.Р. у 2006—2009 гг.». (У арыгінале надпіс парасійску.) Гэты барэльеф усталяваны днямі на лесвіцы, якая вядзе да галоўнага ўваходу ў тэатр.

Цікава, што ў сюжэт суботняга выпуску «Наших новостей» на АНТ, прысвечаны прыёмцы будынку пасля рэканструкцыі прэм'ер-міністрам Сідорскім, шыльда ў памяць Лангбарда хоць і згадваецца, але камера паказвае яе мімаходзь. Прачытаць надпіс цалкам тэлеглядач бы пры ўсім жаданні не змог, а рэпарцёр яе чамусьці не агучыў.

Адкуль такая сціпласць? Ясна, што ідэя ўвекавечыць «даручэнне Прэзідэнта РБ» нарадзілася не ў галаве кіраўніка дзяржавы. Хутчэй за ўсё, гэта прыдумка аўтараў барэльефа. Але ж зацвярджаўся праект, відаць, на самым высокім узроўні.

Што ж, і ўвесь праект рэканструкцыі, і гэтую яго частку ацэняць некалі нашы ўдзячныя нашчадкі.

**Віталь Тарас**

# «Многія ў Расіі назавуць гэтую кнігу русафобскай»

У Мінску прайшла прэзентацыя кнігі Анатоля Тараса «Анатомия ненависти: русско–польские конфликты в XVII–XX вв.».

«Чаму менавіта анатомія нянавісці? — кажа аўтар. — Бо ў гэтых адносінах не было ніводнай светлай плямы». Масква столькі зрабіла кепскага палякам, што тыя «яшчэ мала ненавідзяць рускіх».

«Безумоўна, многія ў Расіі назавуць гэтую кнігу русафобскай і антырасійскай, — усміхаецца аўтар, «але такая была палітыка ў нашых суседзяў».

«Мяне нават неяк спыталі: «Колькі табе палякі заплацілі грошай?». Але я ў кнізе крытыкую і палякаў. Перадусім за бяздарную і злачынную палітыку ў дачыненні да беларусаў у 1920—30-я. Нездарма насельніцтва вітала Чырвоную Армію», але потым саветы паказалі сябе ў самай красе, і дасталося і палякам, і беларусам, і яўрэям.

### «Имперские отношения» разбіраюць як гарачыя піражкі

Аўтар сумленна прызнаецца, што гэтая кніга не зробіць перавароту ў навуцы. Што ўсе факты, пра якія ён піша, вядомыя прафесійным гісторыкам, але гэта вельмі вузкае кола. Асноўная маса не ведае такіх фактаў.

Таму А.Тарас сістэматызаваў вядомыя польскія, расійскія, беларускія крыніцы і даследаванні (больш за 120 прац) і выклаў у чытэльнай форме, даступнай самаму шырокаму колу чытачоў.

Аўтар упэўнены ў тым, што кніга разыдзецца. Яна выйшла накладам 3000 асобнікаў. Прычым палова накладу адразу сыходзіць у Расіі.




**Анатомия ненависти. Русско-польские конфликты в XVIII—XX вв.** — Мінск: Харвест, 2008. — 832 с.

«Там таксама хапае разумных людзей, якія цвяроза глядзяць на сваю гісторыю».

### Зламаць стэрэатыпы

А.Тарас слушна заўважае, што базавыя гістарычныя веды абсалютна большасць насельніцтва атрымлівае ў школах, а ў школах для сённяшніх 30—50 гадовых гісторыя выкладалася з прарасійскіх пазіцый, таму ягоныя кнігі спрабуюць хоць неяк зламаць стэрэатыпы, якія жывуць у большасці насельніцтва. Давесці, «што Беларусь — гэта не Расія і не Польшча».

Але наіўна думаць, кажа А.Тарас, што па прачытанні такіх кніг працэнт нацыянальна свядомых павялічыцца.

«Старыя стэрэатыпы цалкам адамруць, калі на змену старому прыйдзе маладое пакаленне, для якіх Масква — гэта ўсяго толькі сталіца суседняй дзяржавы».

**АГ**

ДЫСКАГРАФІЯ

# P.L.A.N.



У пошуках страчанага, APL–records, 2008

Чарговы альбом лірычна-патрыятычных пошукаў лідэра гурту P.L.A.N. — песні пад акустычную гітару з гармонікам, баянам і скрыпкай на тэму любові да Радзімы. Плясанаў латае дзіркі беларускай музычнай гісторыі. Во такога пяшчотна запісанага unplugged-альбому яўна не ставала недзе на зломе 1980-х і 1990-х (а то і раней). Музыка, напэўна, і не ставіў мэты абудзіць да дзеяння ды трапіць на айподы моладзевых актывістаў. Гэты альбом — ягоны чарговы крок да Беларушчыны, ягоная споведзь, ягонае прызнанне. Гэта сведчанне таго, што ён усё яшчэ ў руху і ягоная Беларусь яшчэ напаўняецца сэнсам. Таму паўстае тут не 60-гадовы рок-н-рольшчык, а кволы 17-гадовы юнак-патрыёт, які нясмела і няхай не сваімі словамі, але ўпэўнена вымаўляе: «Не спі, ты ж мой край дарагі. Прачніся, былая краіна!». Ад таго і такая звышкатэгарычнасць — «Ні Пушкін, ні Чарнышэўскі... не сагрэюць тваіго сэрца» (не надта ўдалая варыяцыя на тэму «Пляцу Францыска» ULIS), і ад таго такая прага да змагання, як у песеньцы «Конь вороной», што зрабілася «Песняй случчака»: «Пад маскалем жыць — марнаваць жыццё, застаецца ў лес, альбо ў небыццё». Альбом на зацятага аматара патрыятычных песняспеваў, які, аднак, можа зайсці і прыхільнікам Барыса Грабеншчакова з Дзіланам.

Плясанаў латае дзіркі беларускай музычнай гісторыі.

**Сяргей Будкін**

# Рок-каранацыя-2008



## 14 сакавіка

**Маладзечна, Палац культуры (Цэнтральная пл., 4)**

**18.00**

Андрэй Лянкевіч

У Рок-каранацыі-2008 бяруць удзел: **«Ляпіс Трубяцкой»**, **Neuro Dubel**, **«Крама»**, **этна-трыо «Тройца»**, **«Без билета»**, **«Детидетей»**, **IQ48**, **«Садъ»** (Брэст), **«Авангардшкола»** (Магілёў), **«Князь Чарадзей»** (Полацк), **Андрэй Іваноў** («Зарціпо»), **ESPRIT**.

Упершыню за 14-гадовую гісторыю цырымоніі рок-музыкі выступяць у суправаджэнні сімфанічнага аркестру Маладзечанскай музычнай вучэльні. Згоду на выступ ужо далі ўладальнікі галоўнай Рок-кароны-2007 Neuro Dubel, а таксама героі мінулага году — «Ляпіс Трубяцкой», этна-трыо «Тройца», IQ48, «Детидетей». Усяго ў «Рок-каранацыі» возьме ўдзел з тузін камандаў. Ужо вызначаны спіс намінацыяў сёлетняй цырымоніі: «Альбом году», «Песня году», «Кліп году», «Выканаўца году», «Традыцыі і сучаснасць», «Рок-князёўна» і «Рок-карона».

Сёлета «Рок-каранацыя» апошні раз пройдзе пад гэтай назвай. Налета ад слова «рок» у назве вырашана адмовіцца.

**«Тузін Гітоў»**




**10 сакавіка ў Моладзевым тэатры эстрады** заспявае польскі камерны вакальны ансамбль Affabre Concinui. Калектыў быў створаны ў 1983 г. у Познані. У рэпертуары калектыву як творы Эпохі Адраджэння, так і сучасныя поп-хіты. Назва ансамблю перакладаецца з лаціны як «абсалютна гарманічныя». Канцэрт арганізаваны Польскім Інстытутам у Мінску. **Пачатак а 19-й.** Даведкі праз т.: (017) 222-82-96, 213-19-49.

## КАНЦЭРТЫ

### Ляпіс Трубяцкой

**9 сакавіка ў Палацы спорту** — канцэрт «Ляпіса Трубяцкога» з прэзентацыяй альбому Manifest. **Пачатак а 19-й**

### Neuro Dubel

**12 сакавіка ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт Neuro Dubel. **Пачатак а 19-й**

### Pomidor/off

**17 сакавіка ў «Графіці»** — акустычны канцэрт Pomidor/off. **Пачатак а 19-й**

### Зміцер Вайцюшкевіч у Мінску, Рагачове і Бабруйску

**7 сакавіка** Рагачоў і Бабруйск сустрэнуць Зьмітра Вайцюшкевіча. Канцэрт **у Рагачове** будзе ладзіцца **ў малой залі Рагачоўскага дому культуры. Пачатак імпрэзы а 12-й. У Бабруйску** імпрэза адбудзецца **ў грамадска-культурным цэнтры па вуліцы Кастрычніцкая, 33 і пачнецца а 17-й. 8 сакавіка ў к/з «Мінск»** — канцэрт Зьмітра Вайцюшкевіча «Табе адной». **Пачатак а 19-й**

### Naka і Pomidor/off

**8 сакавіка ў «Гудвіне» (пр.Незалежнасці, 19)** — сумесны канцэрт Naka і Pomidor/off. **Пачатак а 19-й**

## ІМПРЭЗЫ

### Дарога і Шлях

**5 сакавіка ў Палацы мастацтваў (Казлова, 3)** адбудзецца прэзентацыя SMS-п'ескі «Дарога і Шлях» Алеся Анціпенкі і Аксаны Спрынчан. Вас чакае сустрэча з Валянцінам Акудовічам, Карынай Анціпенкай, Уладзімірам Арловым, Міхасём Башурам, Пятром Васючэнкам, Зьмітром Вішнёвым, Леанідам Дранько-Майсюком... На слушную «Дарогу і Шлях» цягам вечара будзе скіроўваць бард, паэт, актор Віктар Шалкевіч. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны

### Начная чытанка ў Магілёве

**5 сакавіка ў Магілёве ў цэнтры «Кола сяброў» (зав.Чкалава, 16)** — прэзентацыя дыску «Начная чытанка» з удзелам аўтараў. **Пачатак у 18.30.** Уваход вольны

### Літаратурныя сустрэчы на сядзібе ТБМ

**17 сакавіка ў ТБМ** адбудзецца сустрэча з пісьменнікам Васілём Якавенкам і прэзентацыя новай кнігі аўтара «Нячывелле». **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны

## ВЫСТАВЫ

### Вясельная выстава ў Маладзечне

**Да 7 сакавіка ў Маладзечне** працуе «Вясельная выстава». У экспазіцыі скарыстаныя рэчы з фонду абласнога краязнаўчага музею. У дзень закрыцця выставы плануецца выступ фальклорнага гурту «Гуда».

### Чэшская фатаграфія

**З 5 да 15 сакавіка ў Палацы мастацтваў** працуе выстава «Чэшская фатаграфія» — вынік міжнароднага конкурсу, аб'ўяленага «Чэшскім цэнтрам» на тэму «Найлепшыя фатаграфіі з вандроўкі ў Чэхію».

### Пяшчота зямлі беларускай

**У Мастацкім музеі да 7 сакавіка** працуе выстава твораў Мікалая Ісаенкі «Пяшчота зямлі беларускай».

### Я не мастак. Я толькі вучуся...

**У Мінскім габрэйскім абшчынным доме (В.Харужай, 28) да 6 красавіка** працуе персанальная выстава Данііэля Ліўшыца «Я не мастак. Я толькі вучуся...»



Белапан

### Выстава кавальскага майстэрства

**У Мінску ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры** працуе выстава кавальскага майстэрства «Партрэт вясны ў жалезным абрамленні». Экспазіцыя арганізавана музеем сумесна з Гільдыяй кавалёў. Сярод выстаўленых твораў — каваныя падсвечнікі, люстры, насценныя маскі, мэбля, скульптура, у тым ліку парковая, дэкаратыўныя кампазіцыі, а таксама калекцыя старажытнай зброі VII—XII стст. і старажытных сякер XV—XX стст.



### Лянкевіч у Берліне

**У берлінскай галерэі ACUD** адчынілася персанальная выстава беларускага фатографа Андрэя Лянкевіча Focus on Belarus. Terra Incognita. Сярод здымкаў, выстаўленых у галерэі, можна пабачыць працы з серыі «Пагнства».

### Адзін дзень з жыцця жанчыны: мары і рэчаіснасць

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 46) да 8 сакавіка** працуе выстава «Адзін дзень з жыцця жанчыны: мары і рэчаіснасць».

### Жыццё Айчыне, гонар нікому

**У Нацыянальнай бібліятэцы да 23 сакавіка** працуе выстава «Жыццё Айчыне, гонар нікому», прысвечаная 180-годдзю з дня нараджэння славутага калекцыянера і грамадскага дзеяча графа Эмерыка фон Гутан-Чапскага.

### Чароўныя лялькі

**У Доме-музеі I з'езду РСДРП (пр.Незалежнасці, 31а) да 4 траўня** працуе выстава «Чароўныя лялькі».

### Дзікія кветкі вясны

**У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (М.Багдановіча, 7а) да 20 сакавіка** працуе выстава лялек украінскай мастачкі Аксаны Цюпы «Дзіўныя кветкі вясны».

### Велікодная пісанка

**Музей народнага беларускага мастацтва ў Раўбічах** запрашае на майстар-клас «Велікодная пісанка». **Заняткі ладзяцца ў суботы (14, 21, 28 сакавіка і 4, 5 красавіка) а 13-й гадзіне**

### Abstract-2009

**У Палацы мастацтваў (Казлова, 3) да 15 сакавіка** працуе выстава Abstract-2009, прысвечаная 90-годдзю Віцебскай мастацкай школы.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Падыграйце мільянеру

**Мільянер з трушчобаў** (Slumdog Millionaire)
Вялікабрытанія — Індыя, 2008, каляровы, 120 хв.
**Рэжысёры:** Дэні Бойл, Лаўлін Тандан
**Жанр:** Меладрама
**Прэміі:** 4 «Залатыя глобусы», 8 «Оскараў»
**Адзнака:** 7,5 (з 10)

Сірата Джамаль Малік, які вырас у індыйскіх трушчобах, трапляе на гульню «Хто хоча стаць мільянерам» — за адзін крок ад выйгрыша 20 мільёнаў рупій. Але героя арыштоўваюць за махлярства, бо не вераць, што жабрак сам ведае ўсе адказы. Джамаль расказвае следчым сваю гісторыю з прыгодамі, пакутамі, наканаваннем — і любоўю.

Ва ўсёй гісторыі мастацтва ёсць толькі некалькі сюжэтаў. «Мільянер з трушчобаў» — менавіта такі універсальны сюжэт, зразумелы ў Бамбеі і Галівудзе, Беларусі і Аўстраліі.

Бедны становіцца багатым, бедны ратуе сваё каханне.

Карціна — трыумф глабалізацыі, тэрмаядзерны express-кактэйль з індыйскімі жабракамі і бандытамі, з каляровымі шаўкамі, са стрэламі ў санвузле, засыпаным грашыма, з цнатлівымі позіркамі ды спевамі.

«І мы! І мы! І мы!» — беларускія студыі таксама будуць крычаць пра гульню і шанец, пра свае мільёны з «чорным катом». Але лёс падыгрывае толькі таму, хто бяжыць насустрач яму — і дзеля любові жыве.

**Андрэй Расінскі**

# «Белсат»: тэлепраграма на 9—15 сакавіка
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 9 сакавіка, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял, 16 серыя
**19.00** «1945: год, які змяніў свет, дак. фільм, рэж. Гэбі Кент, 2005 г., Вялікабрытанія, ч. 3
**20.00** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20.35** Еўрасаюз без сакрэтаў (інфармацыйная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)




**21.20** Хто ёсць кім?: Валянціна і Валянцін Нагорныя
*Муж з жонкаю. Выпускнікі Мінскага тэатрально-мастацкага інстытуту. Абое акторы і рэжысёры. У 1975 г. прыехалі ў Полацк. Ён стаў кіраўніком тэатральнага гуртка для дарослых, а яна ўзначаліла моладзевы тэатр — і гэтак сталіся сэрцам тэатральнага жыцця гораду, паставіўшы і зграўшы ў дзесятках спектакляў ды прынёсшы вядомасць полацкай сцэне. У Нагорных было мноства перамог у тэатральных конкурсах і запрашэнняў у прафесійныя тэатры і кіно. Аднак яны засталіся ў горадзе, хоць жыццё прымусіла Валянціна заняцца іншаю творчасцю — працаю з дрэвам.*
**21.45** «Гэтыя і тыя», маст. фільм, рэж. Клод Лелюш, 1981 г., Францыя, ч. 2. У ролях: Рабэр Асэйн, Джэралдына Чаплін, Даніэль Альбрыхскі.
**23.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 21 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 10 сакавіка, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 21 серыя
**19.00** «Адэса... Адэса!», дак. фільм, рэж. Мішэль Баганім, 2004 г., Ізраіль—Францыя
**20.40** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выпуск)
**21.20** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Трысняговы танец», дак. фільм, рэж. Анджэй Фідык, 2000 г., Польшча
*Афрыканскае каралеўства Свазіленд вабіць турыстаў сваімі дзіўнымі звычаямі, сярод якіх зажынкі, але не жыта, як у беларусаў, а... трыснягу. Здавалася б, нічога не можа засмуціць гэтых жыццярадасных людзей, замінуць ім весяліцца, танчыць і кахацца, калі забыць пра тое, што ў Свазі не ведаюць кантрацэпцыі, а народ вымірае ад эпідэміі СНІДу...*
**22.20** Форум: Рэфармаванне ці толькі перафарбоўка фасаду?
**23.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 1 серыя
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 11 сакавіка, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 1 серыя
**18.55** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**19.10** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**19.40** «Доўгі цень Чэ Гевары», дак. фільм, рэж. Вілфрыд Гёйсман, 2007 г., Германія
**20.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** YoLife! (моладзевая праграма)
**21.40** Госць «Белсату»: Павел Мажэйка размаўляе з палітолагам Дзянісам Мельянцовым.
**21.55** «Сон-трава», канцэрт гурту «Тройца», ч. 1
**22.25** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**23.00** «Мент», дэтэктыўны серыял, 17 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 12 сакавіка, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 17 серыя
**18.55** Падземка (беларускі хіт-парад)
**19.35** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «ІзГоі», дак. фільм, рэж. Аляксандр Ступнікаў, 2009 г., Беларусь
**20.35** Кухня (музычная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.00** «Лекар душы», рэпартаж, 2008 г.
**22.20** Інтэрнаўты выбіраюць
**23.15** «Мент», дэтэктыўны серыял, 18 серыя



**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 13 сакавіка, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 18 серыя
**19.00** «Без рэтушы»: «Песня на два галасы», дак. фільм, рэж. Юрый Каліна, 2009 г., Польшча
**19.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.55** «Невядомая Беларусь»: «Пішчалаўскі замак», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**20.25** Маю правы (прававая праграма)
**20.40** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»: Павел Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
*Алег Алкаеў — былы начальнік мінскай турмы, цяпер уцякач у Германіі — напісаў кніжку пра пенітэнцыярную сістэму ў Беларусі, якая выклікала цэлую буру ва ўладных структурах краіны. Кніга расказала аб практыкаваных у сённяшняй Беларусі формах нелегальнага знявolення, пра зніклых апанентаў улады.*
**21.35** «Чарада пачуццяў», меладраматычная камедыя, рэж. Радаслаў Піваварскі, 1993 г., Польшча.
**23.00** «Пітбуль», серыял, 17 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 14 сакавіка, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**18.45** «Рэвалюцыя: як гэта робіцца», дак. фільм, рэж. Катарына Рэйгер, Эрык ван дэн Брук, 2001 г., Нідэрланды
*Фільм пра гісторыю сербскага моладзевага руху «Отпор» уключае унікальны запіс бяскроўнага ўзяцця пад варту Мілошавіча, да чаго мела дачыненне і гэтая студэнцкая арганізацыя.*
**19.40** «Бульбаны», мультсерыял
**19.50** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**20.20** Кружэлка (сусветная музыка)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** «Невядомая Беларусь»: «Сабачая будка», дак. фільм, рэж. Уладзімір Самойлаў, 2009 г., Польшча







*Пад Мінскам, сярод лесу, з'явіўся малады пародзісты сабака. З трыма лапамі. І адна з ацалелых лап знявечаная. Інваліда, відаць, выкінулі гаспадары якога з найбліжэйшых элітных лецішчаў, дзе жывуць чыноўнікі ды афіцэры. Непадалёк — дом ветэранаў і аўтобусны прыпынак, адкуль ветэраны ездзяць у сталіцу або на базар. Насельнікі дому пачалі падкормліваць сабаку, хаця да сябе не ўзялі: не дазваляе рэжым. Штодня а сёмай раніцы да сабакі прыхodзіць ветэран Пётр Равуцкі, каб накарміць і прылашчыць, а жывёліна прызнае яго за свайго гаспадара.*




**21.45** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.15** «Мяне завуць Бах», маст. фільм, рэж. Дамінік дэ Рыва, 2003 г., Германія—Швейцарыя.
*Прусія, 1747 год. Маладога і амбітнага караля Фрыдрыха яшчэ не пачалі называць Вялікім. Славуты Іаган Себасцьян Бах наведвае свайго сына пры патсдамскім двары... Малавядомая гісторыя стасункаў вялікага кампазітара з будучым вялікім каралём узнаўляе атмасферу эпохі.*
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 15 сакавіка, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.20** «Ранча», серыял, 17 серыя
**19.10** Канцэрт лаўрэатаў конкурсу ў межах фестывалю музыкі Маладой Беларусі «Басовішча-2008»: гурты «Глюкі», «Шпіталь Ф» і «Тлуста Луста».
**19.40** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**20.10** «1945: год, які змяніў свет», дак. фільм, рэж. Гэбі Кент, 2005 г., Вялікабрытанія, ч. 4
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Форум: Каму служыць беларускі чыноўнік
*Сучасная Беларусь — краіна імітацыйнай дэмакратыі. Выбары быццам бы і праводзяцца, але хто пераможа, ужо вядома загадзя. Ва ўсялякім выпадку — не апазіцыя, і не тыя, каго вылучыла грамада, — як бы ні стараліся і колькі б галасоў насамрэч ні атрымалі. У такіх варунках стрыжнем дзяржаўнай улады становіцца чыноўнік. Дарэчы, слова «міністр» з лаціны перакладаецца як «слуга». Дык хто ён, цяперашні беларускі чыноўнік, — народны слуга ці нечы паслугач?*



**22.05** «Ад-магілы-да-магілы», маст. фільм, рэж. Ян Цвіткавіч, 2005 г., Славенія.
*Стары кавалер Пэра жыве ў маленькай славенскай вёсцы разам з дзвюма сёстрамі — Вільмаю, якая мае сына Джоні, і глуханямою Ідаю, а таксама з бацькам, які цягам шасці гадоў не можа змірыцца са смерцю жонкі. Пэра зарабляе на жыццё прамовамі на хаўтурах. Але ён далёка не самы вялікі дзівак з усіх насельнікаў вёскі — самадастаткова мікрасвету, які ў сваёй усеабдымнасці спалучае камічныя і трагічныя бакі чалавечага жыцця... Фільм атрымаў гран-пры на Фестывалі ўсходнееўрапейскіх фільмаў у Котбусе (Германія, 2005 г.), прыз за найлепшы сцэнар на фестывалі ў Турыне (2005 г.) і быў прызнаны найлепшым балканскім фільмам году на фестывалі ў Сафіі (2006 г.).*
**23.50** «Бульбаны», мультсерыял
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

# Новая фішка ў моладзі

Сярод старэйшых школьнікаў і студэнтаў пайшла новая мода: пакідаць паўсюль пустыя пачкі ад соку «Садочак» з надпісам 5700.

«Гэта проста прыкол, — кажа адзінаццацікласнік Дамінік. — А чаму так робяць? Бо дасталі ўсе гэтыя прафілактычныя гутаркі».

«Ды мне ўвогуле не падабаецца ўсё, што ў нас робіцца ў краіне, але мы ж не можам пратэставаць — могуць са школы выгнаць», — кажа ягоны сябар Ягор.

Як вядома, менавіта пакет ад соку, начынены выбухоўкай, што не разарваўся, стаў галоўным фактам для следства па выбуху 3 ліпеня. У часе яго без асаблівых на тое падставаў арыштоўваліся дзесяткі людзей, пераважна — іншадумцаў і палітычных актывістаў, а мільёны людзей прапусцілі праз прынізлівую працэдуру здачы сліні і дактыласкапіі, нібы падазроных.

Сярод іншага, следства спрабавала выявіць прадаўца, які напісаў на пачку з сокам цэннік «5700».

**Мікола Бугай**



PROSTO-FREELIVEJOURNAL.COM

**Каму больш балюча?**

## ЖАРТЫ

Двое мужчын гуляюць у гольф. Адзін замахнуўся, каб ударыць па мячыку, і раптам убачыў, што ўдалечыні праходзіць пахавальная працэсія. Тады ён спыніў рух, зняў капялюш і знерухомеў на знак павагі. Ягоны сябар, уражаны, прамовіў: «О! Тваё паводзіны — узор чуллівасці і далікатнасці». А першы яму: «Дзіва што. Мы ж былі з ёй разам 35 гадоў».

* * *

Афіцыянтка прыносіць кліенту рахунак:

« 1. Салат «Світанак» — 7 тыс.
2. Біткі — 12 тыс.
3. Гарнір — 2 тыс.
4. Пракаціла — 7 тыс.
5. Піва — 6 тыс.
Усяго — 34 тыс.».

Кліент дастае кашалёк, але, затрымаўшы позірк на аркушыку, пытаецца: «Хвілінку, а што такое пракаціла?» Афіцыянтка, беручы рахунак, закрэслівае чацвёрты радок і кажа: «Гэтым разам не пракаціла».


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КВАТЭРА

**Здам** 2-хпакаёвую кватэру на працяглы тэрмін. Т.: (029)757-94-07

### ПРАЦА

**Выпускнік БДУ** (радыёфізіка (КБ)) шукае працу з магчымасцю далейшага размеркавання. Ведаю C++, асэмблер, маю досвед праграмавання DSP. Англійская на ўзроўні чытання тэхлітаратуры, базавыя польская, іспанская. Лёгка навучаюся. Т.: (029) 501-17-89 (Яўген), jauhienas@gmail.com

**Дапаможам** напісаць віншавальны тэкст. Тэксты розных узроўняў складанасці — ад набору да друку, можна з касеты ці па тэлефоне, пераклады з розных моваў. а/с 195, 220030, Мінск, (029) 753-91-96, alesknigi@mail.ru

### КНІГІ

**Куплю** кнігу М.Ермаловіча «Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае». Т.: (029) 820-06-57

**Куплю** Біблію ў перакладзе Станкевіча. Пісаць на foxini@tut.by

**Віншуем** прыгожую палову чалавецтва са святам вясны! Прапануем найлепшыя танныя падарункі, «Беларуская кухня», Арлоў (камплект аўдыёкніг), Клінаў «Дванадцаць», для мінчукоў і гасцей сталіцы (бел., англ. мовы), «Горад СОНца», дашлем спіс прапановаў: а/с 195, 220030, Мінск, (029) 753-91-96, alesknigi@mail.ru

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Антон Астаповіч 15 сакавіка запрашае** ў краязнаўчую вандроўку «Астравецкі рэквіем»: Жодзішкі — Гервяты — Міхалішкі — Тракенікі — Быстрыца — Варняны — Астравец — Гудагай. Т.: (029) 111-73-32, (017) 262-73-43

**Запрашаем у падарожжы** «Замкі Беларусі» 22 сакавіка (нядзеля) па маршруце: Мінск—Мір—Навагрудак—Любча—Шчорсы—Ліда—Іўе—Мінск. 29 сакавіка (нядзеля): Беніца—Крэва—Баруны—Гальшаны—Вішнева—Дзесятнікі—Валожын. Т.: (029) 622-57-20; (029) 509-12-16; (029) 110-19-28; 292-54-58



## «НН» запрашае на сталую працу

мэнэджэра па распаўсюдзе з правамі кіроўцы і машынай. Заробак высокі, калектыў беларускі. Прапановы і звесткі пра сябе кіруйце на э-пошту nn@nn.by. Рэкамендацыі і досвед працы вітаюцца, але не канечне, каб яны былі.



**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!


## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Жалудок Лідскага пав.** Тут ёсць вялікая старасвецкая карчма, каторая належыць да памешчыка князя Ч. Ён перабудаваў карчму пад краму і чайную. З крамы князь бярэ 50 руб. Арэнды — значыць, не шмат. Княгіня адкрыла тут бальніцу на 10 ложкаў; лечаць дарма.

**«Наша Ніва». №9. 1909 г.**


**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа вядзьдзя і надта патрэбная. Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз т.:
(017) 284-73-29,
(029) 260-78-32,
(029) 618-54-84


# Самае вялікае люстра ў свеце

Гэта дзіўнае месца знаходзіцца ў Балівіі і з’яўляецца каласальнай крыніцай солі.

Саланчак Уюні (Salar de Uyuni) змяшчае каля 10 млн тон солі, з якіх штогод здабываецца менш за 25 тыс. тон

У сезон дажджоў паверхня гэтай салянай пустэлі ператвараецца ў гіганцкае люстра. Высахлыя саляныя азёры раскінуліся на поўдні пустыннай раўніны Альціплано ў Балівіі на вышыні 3650 метраў над узроўнем мора.

Плошча Уюні — 10 582 км$^2$.




**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.


12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5550. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 03.03.2009.
Замова № 1173.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614
9771819161008 09009